

АД «МІС БЕЛАРУСЬ» ДА «МІС ЕЎРОПА КАНТЫНЕНТАЛЬ»

ЧЫРВОНКА

КАЛІ ЗАГАДЧЫК ДЗІЦЯЧАГА САДКА... МУЖЧЫНА

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 СНЕЖНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 247 (30127)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр РАГОЖНІК, міністр прамысловасці:**

*«Па выніках 2022 года прадпрыемствамі Міністэрства прамысловасці быў забяспечаны рост экспарту прадукцыі на 15,3 працэнта да рэкордных за апошняе дзесяцігоддзе $6,1 млрд. У бягучым годзе за 10 месяцаў экспарт узрос на 13,3 працэнта да $5,6 млрд. У цэлым за 2023 год экспарт Мінпрама дасягне, паводле ацэнкі, $6,5 млрд і перавысіць максімальны за дзесяцігоддзе ўзровень 2022 года на 7,3 %.*

# Тралейбус ідзе ў свята



Фота БелТА.

По Магілёве пачалі курсіраваць «навагоднія» тралейбусы. Яны аздобленыя святочнай ілюмінацыяй звонку і навагодняй атрыбутыкай унутры. Такі падарунак гараджанам і гасцям зрабіў Магілёўскі філіял «Тралейбусны парк № 1». Кіроўцы апранулі ўборы Дзядоў Марозаў, а кандуктары — адна з іх, Алена ПАПОВА, на гэтым фота — касцюмы Снягурак.

## КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову аб прадаўжэнні на 2024 год бязвізу для жыхароў Літвы, Латвіі і Польшчы.**

• Спецыяльная прэмія Прэзідэнта Беларусі «Беларускі спартыўны Алімп» 2023 года прысуджана Міхаілу Дваракову, Ванэсе Каладзінскай і Ганне Эйсмант.

• **Арганізацыі аховы здароўя краіны будуць працаваць па графіку работы ў суботні дзень 23 снежня, 30 снежня і 6 студзеня. Па графіку выхаднога дня будзе арганізавана работа 24 снежня і 31 снежня. Рэжым святочнага дня будзе дзейнічаць 25 снежня, 1, 2 і 7 студзеня.**

• Грамадскі транспарт у Мінску ў навагоднюю ноч будзе працаваць да 5 раніцы.

• **У Гродне ўпершыню правялі аперацыю па замене аартальнага клапана з выкарыстаннем уласных тканак пацыента.**

• Прэзентацыя першага тома кнігі «Сі Цзіньпін аб дзяржаўным кіраванні» на беларускай мове адбылася ў Мінску.

Передсвяточнае

## Сто найменняў падарункаў, сорак найменняў шампанскага

### Многія сотні навагодніх кірмашоў і больш за 9 тысяч святочных распродажаў

**Па ўсёй краіне сёлета будзе працаваць каля 950 ёлачных базараў. А крамы правядуць каля 12 тысяч акцый і распродажаў. Як падрыхтаваліся гандаль і грамадскае харчаванне да навагодніх і калядных свят, расказалі начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА і начальнік Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алена НАГОРНАЯ.**

### Больш, чым летась

Як адзначыла Наталля Мельнікава, у бягучым годзе ва ўсіх рэгіёнах ужо арганізавана работа каля 620 святочных кірмашоў, якія адкрыты ўжо з 8 снежня. «Адзначу, што ў 2023 годзе па ўсёй краіне арганізавана максімум кірмашоў, прымеркаваных да навагодніх і калядных свят, што на 4 працэнты больш, чым летась», — заўважыла яна. У сталічных Палацы Рэспублікі і Палацы Незалежнасці пройдуць святочныя мерапрыемствы ў рамках акцыі «Нашы дзеці».

Акрамя таго, дадала спікер, пачалі работу ёлачныя базары.

СТАР. 4

Нашы людзі

## ДЗЕД МАРОЗ ПА ПРОЗВІШЧЫ АФАНАСЬЕЎ

**Галоўнага гаспадара навагодніх свят заўсёды чакаюць не толькі дзеці, але і дарослыя. Высокі статны дзед з сівой барадой у іскрыстай шубе ўвасабляе дабрыню і цуд, які абавязкова павінен здарыцца пад Новы год. Такім увасабленнем на працягу 30 гадоў для жыхароў Шумілінскага раёна стаў Юрый АФАНАСЬЕЎ, які нястомна запрашае маленькіх і дарослых шумілінцаў у дзівосны казачны свет.**



СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23247>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

# У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

**Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
19 снежня 2023 г. № 397 г. Мінск

## АБ ПРЫСУДЖЭННІ ПРЭМІІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае ўмацаванню духоўных каштоўнасцяў і маральных традыцый беларускага народа, патрыятычнаму выхаванню моладзі, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2023 года:

**ігумені Анфісе (Любчак Антаніне Стахаўне), настаяцельніцы Свята-Пакроўскага жаночага манастыра г. Талачына Віцебскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы**, — за вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцяў, культурнае і маральнае выхаванне дзяцей і моладзі, актыўны ўдзел у адраджэнні культурна-гістарычных каштоўнасцяў Віцебшчыны;

**калектыву дзяржаўнай установы адукацыі «Полацкае кадэцкае вучылішча»** — за плённую дзейнасць у грамадзянска-патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення;

**калектыву дзяржаўнай установы «Гомельскі гарадскі цэнтр інклюзіўнай культуры»** — за актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, значны ўклад у развіццё творчых здольнасцяў і сацыяльную адаптацыю людзей з абмежаванымі магчымасцямі;

**калектыву дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця» Міністэрства аховы здароўя** — за выдатныя дасягненні ў паляпшэнні якасці і даступнасці медыцынскай дапамогі, папулярызацыю ў грамадстве сямейных каштоўнасцяў;

**калектыву ўстановы культуры «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы»** — за значны ўклад у захаванне культурнай спадчыны Беларусі, рэалізацыю рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»).

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2023 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка.**

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
19 снежня 2023 г. № 398 г. Мінск

## АБ ПРЫСУДЖЭННІ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ПРЭМІІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. За выдатныя дасягненні ў галіне тэатральнага, музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, **прысудзіць** спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2023 года:

**аўтарскаму калектыву ў складзе Багдановіч Вольгі Тамашаўны, намесніка начальніка аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, Вярсоцкага Аляксандра Людвігавіча, старшыні Свіслацкага райвыканкама, Чыкавай Алены Анатольеўны, намесніка старшыні праўлення Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства**, — за значны ўклад у рэалізацыю творчых праектаў па зберажэнні традыцыйнай культуры Беларусі, правядзенне каравай-фэсту «Бацькава булка»;

**Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству «Беларускае тэлеграфнае агенцтва», Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь** — за значны ўклад у захаванне гістарычнай памяці і праўды пра Вялікую Айчынную вайну і рэалізацыю праектаў «Апошнія сведкі», «Генацыд. Без права на жыццё»;

**заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму духавому аркестру «Віціны» дзяржаўнай установы адукацыі «Стаўбцоўская дзіцячая школа мастацтваў»** — за значны ўклад у выхаванне творчай моладзі, актыўны ўдзел у грамадска-культурных праектах;

**заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь узорнаму тэатру эстраднай песні «Сябрынка» філіяла адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» «Палац культуры МАЗ»** — за развіццё найлепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнага мастацтва, актыўны ўдзел у мерапрыемствах патрыятычнай тэматыкі;

**Жыган Іване, актрысе, рэжысёру, грамадскаму дзеячу, і калектыву дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага»** — за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю славянскай культуры, рэалізацыю сумесных беларуска-сербскіх творчых праектаў;

**Лукашэнка Ганне Сяргееўне, паэту-песенніку, заснавальніку таварыства з абмежаванай адказнасцю «МУЗЫЧНАЯ МЕДЫЯКАМПАНІЯ»**, — за вялікі асабісты ўклад у развіццё сучаснага музычнага мастацтва, рэалізацыю сацыяльна значных культурных ініцыятыў;

**Макарэвічу Руслану Алегавічу, індывідуальнаму прадпрымальніку, майстру народных музычных інструментаў**, — за плённую працу па адраджэнні традыцый вытворчасці музычных інструментаў;

**Масквіной Настассі Ігараўне, загадчыку трупы оперы дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь», народнай артыстцы Беларусі**, — за высокае прафесійнае майстэрства, выдатныя дасягненні ў галіне музычна-тэатральнага мастацтва;

**1-й і 2-й ротам ганаровай варты камендацкага батальёна Мінскай ваеннай камендатуры, аркестру ганаровай варты Мінскай ваеннай камендатуры** — за значныя дасягненні ў патрыятычным выхаванні моладзі, актыўны ўдзел у грамадска-палітычных і культурных мерапрыемствах;

**Шунейка Алене Феліксаўне, метадысту дзяржаўнай установы культуры «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці»**, — за плённую працу па захаванні традыцый вырабу габеленаў.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2023 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка.**

Знаёмімся з лаўрэатамі

# «Купалле» ў Александрыі — скарбніца народных традыцый

ШТОГОД у першых чыслах ліпеня маленькі аграгарадок Александрыя на мяжы Магілёўскай і Віцебскай абласцей ператвараецца ў месца паломніцтва тысяч гасцей. Пачынаючы з 2010 года, краіна маштабна адзначае тут свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), якое традыцыйна наведвае Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У гэты дзень на маляўнічым беразе Дняпра шмат песень, народных строяў, гульняў, забаў, смачных страў нацыянальнай і замежных кухняў. Праект рэспубліканскага значэння, але ў яго аснове работа сапраўдных прафесіяналаў з Магілёўскага абласнога цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы. І тое, што гэта дзейнасць адзначана на самым высокім узроўні, вельмі паказальна. Адна з пяці прэмій «За духоўнае адраджэнне» сёлета прысуджана менавіта гэтаму калектыву «за значны ўклад у захаванне культурнай спадчыны Беларусі і рэалізацыю культурна-турыстычнага праекта — свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»)».

— Мы робім сваю любімую справу і вельмі прыемна, калі вынікі гэтай работы адзначаюць на высокім узроўні, — падзяліўся радаснымі эмоцыямі **дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Алег ХМЯЛЬКОЎ**. — Гэта ганарова, у першую чаргу таму, што нас ацаніў Прэзідэнт, Магілёўскі аблвыканкам, Міністэрства культуры. Мы праводзім шмат розных фестываляў. Сярод іх: «Форум традыцыйных культур», на якім падымаем пытанні міжнароднага ўзроўню, «Залатая пчолка», музычнае свята для дзяцей, «Вянок сяброўства», на якім свае народныя традыцыі дэманструюць госці з розных краін, і іншыя — у нас вельмі вялікая палітра. Гэта наша прафесія, і мы робім яе з любоўю. Над падрыхтоўкай да свята «Купалле» ў Александрыі працуе каля 4000 толькі нашых работнікаў — калектыў метадцэнтра (каля 60 чалавек, кожны па сваім кірунку) і плюс у сярэднім па 150 творчых работнікаў ад кожнага раёна Магілёўшчыны. Мы распрацоўваем канцэпцыю — што датычыцца адкрыцця, кірмашу, абярэгаў і гэтак далей, і ставім задачы ўсёй краіне. Само свята — вынік вялікай агульнай работы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Рухацца, бачыць, чуць ім дапамагае творчасць



Фота Гомельскага гарадскога цэнтра інклюзіўнай культуры.

АДЗІНАЯ ў сваім родзе ў краіне ўстанова культуры, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, з рознымі катэгорыямі інваліднасці займаюцца разам з фізічна здаровымі. Вялікая каманда ў амаль 500 чалавек, якая мае магчымасць развіваць самую розную творчую дзейнасць. Усё гэта пра Гомельскі гарадскі цэнтр інклюзіўнай культуры.

— Разам даказваем, што і людзі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця могуць выступаць на вялікай сцэне, пісаць п'есы, маляваць і майстраваць, — звяртае ўвагу **дырэктар цэнтра інклюзіўнай культуры Ірына ЦЯПУГІНА.**

Ва ўстанове сёння адкрыта больш за 20 клубных фарміраванняў рознай жанравай накіраванасці: ад тэатральнага, дэкаратыўна-прыкладнога, выяўленчага мастацтва да харэаграфіі. Ёсць тэатр жэставай песні, кінавідэастудыя, дзе здымаюцца сацыяльныя ролікі па безбар'ерным асяроддзі, папулярызацыі вывучэння мовы жэстаў.

— Летась мы стартавалі з праектам «Дзеці вайны». Свaімі сіламі знялі фільм пра гісторыі людзей, чыё дзяцінства прыйшлося на гады Вялікай Айчыннай. Адна з гераінь, якая з дзяцінства слаба чула, падзялілася, як яна са сваёй асаблівасцю перажыла выпрабаванні ваеннага часу. Сёння гэты наш праект удзельнічае ў конкурсе Міністэрства культуры Беларусі, — адзначае Ірына Аляксандраўна.

Гомельскі гарадскі цэнтр інклюзіўнай культуры развівае і праект «Важны жэст». Мове жэстаў навучаюцца работнікі сферы абслугоўвання, спецыялісты сацыяльна значных устаноў. Унікальны праект, якому крыху больш за год, — «Рукі бачаць» — прапануе паглыбленне ў свет невідушчых. У поўнай цемры чалавеку прапануецца справіцца з пэўнымі заданнямі, выканаць паўсядзённыя дзеянні. Між тым у Гомельскім гарадскім цэнтры інклюзіўнай культуры не толькі займаюцца людзі з рознымі катэгорыямі інваліднасці, але і працаўладкаваны і працаўладкоўваюцца супрацоўнікі з інваліднасцю.

У цэнтры рэалізоўваецца праект «УпэўненаяЯ». Так, на працягу васьмі тыдняў — са студзеня да 8 сакавіка — у марафоне ўдзельнічае восем дзяўчат, жанчын з рознымі формамі інваліднасці.

Сёння ў цэнтры новае бясплатнае клубнае фарміраванне, у якое ідзе актыўны набор — «Інклюзіўны тэатр мод». Тут людзі рознага ўзросту, з рознымі формамі інваліднасці будуць навучацца мастацтву дэфіле, удзельнічаць у модных паказах нароўні з фізічна здаровымі. Ужо цяпер праект гатовы падтрымаць айчынныя вытворцы адзення, якія будуць даваць свае калекцыі для паказаў.

— Тое, што нас адзначылі на такім высокім узроўні Прэзідэнт, калектыў успрыняў не як час падвядзення вынікаў работы, а доказ таго, што такі гонар трэба пацвярджаць, развівацца далей, станавіцца яшчэ лепшымі, — ад свайго імя і ўсіх, хто займаецца ў Гомельскім гарадскім цэнтры інклюзіўнай культуры, падзякавала Ірына Цяпугіна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «Пляцёнкі» са смакам дзяцінства



БРЭНДАВЫ фэст «Бацькава булка» — свята маладое, сёлета ладзілася другі раз. Але нават за такі кароткі час набыло шырокую папулярнасць і дасягнула статусу рэспубліканскага.

...А штуршком для такой раскруткі стала знакамітая булка-пляцёнка, якая выпякаецца ў свіслацкай пякарні. Хлебапякарня стала вядомай пасля наведвання Прэзідэнтам Свіслацкага раёна некалькі гадоў таму. Аляксандр Лукашэнка асобна адзначыў смак здобнай пляцёнкі «са смакам дзяцінства». Ім была пастаўлена задача стварыць належныя ўмовы працы работнікам хлебапякарні. У хуткім часе гэта даручэнне было выканана, пaведаміў **старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ**. Цэх мадэрнізаваны, з'явілася аўтаматычная печка. Дзякуючы гэтаму палепшыліся ўмовы працы і павялічыліся аб'ёмы вытворчасці. Так, у суткі тут выпякаюць дзве тоны булак з тым самым смакам дзяцінства. Гэта стала свайго роду пасылам для «раскруткі» плеценай булкі, якая ў хуткім часе атрымала афіцыйную назву «Бацькава».

Смачны брэнд падказаў ідэю мясцовага свята, якое ўпершыню адбылося летась. А ўжо сёлета каравай-фэст «Бацькава булка» быў анансаваны як рэспубліканскае свята. Праходзіць свята ў жніўні, падрыхтоўку да яго вядзе спецыяльна створаны аргкамітэт пры Гродзенскім абласным упраўленні культуры. Па словах **галоўнага рэжысёра каравай-фэсту «Бацькава булка» Вольгі БАГДАНОВІЧ**, праграма яго вельмі насычаная.

Усе конкурсы каравай-фэсту так ці інакш звязаны з «хлебнай» тэмай. Сёлета, напрыклад, адбыліся эстафетны конкурс на хуткасць «Бацькава міля», конкурс «Каравай, каравай, каго хочаш — выбірай», праграма «Булка-байкер-шоу» з фігурным катаннем на матацыклах.

— Свята становіцца вельмі папулярным, бо яго тэма блізкая кожнаму, — зазначае Вольга Багдановіч. — Важнасць гэтага прадукту відавочная. Сёлета мы максімальна шырока прадставілі хлебабулачныя вырабы ўсёй краіны, якія ўваходзяць у склад нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Усяго іх восем. У іх ліку — поразаўская банкуха, вясельны каравай са Слоніма, жорaскі хлеб і іншыя. Усе яны прадстаўлены на каравай-фэсце ў Свілачы.

Высокая ўзнагарода ў выглядзе спецпрэміі Прэзідэнта — і радасць, і натхненне, і гарантыя таго, што жыццесцвярджальная традыцыя шанавання хлеба будзе пашырацца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Нашы дзеці

# Месца, дзе адчуваюць клопат і любоў

## У рамках дабрачыннай навагодняй акцыі Наталля КАЧАНАВА наведала Ждановіцкую спецыяльную школу-інтэрнат

**У дзяржаўнай установе адукацыі праходзіць навучанне звыш 70 выхаванцаў са шматлікіх рэгіёнаў Беларусі. Гэта асаблівыя дзеці. Ва ўсіх іх — розныя парушэнні слыху. У спецыяльнай школе-інтэрнаце для хлопчыкаў і дзяўчынак створаны ўсе ўмовы, каб не толькі вучыцца, але і займацца любімай справай. Педагогі праводзяць вялікую работу па інтэграцыі дзяцей са слыхавымі парушэннямі ў грамадства. І ў іх гэта атрымліваецца.**


Фота БелТА.

Высокую ацэнку калектыву школы-інтэрната дала Старшыня Савета Рэспублікі. У іх асобе Наталля Качанава выказала ўдзячнасць усім педагогам і выхавацелям, якія працуюць у такіх установах. «Праца ў іх няпростая, але яны робяць вельмі важную і патрэбную справу для нашай краіны: усяляюць упэўненасць у хлопцаў і дзяўчат, аддаюць цяпло сваёй душы і сэрца, каб дзеці адчувалі любоў, з якой да іх адносяцца ў нашай краіне, у нашай цудоўнай Беларусі», — адзначыла яна.

Спікер верхняй палаты парламента азнаёмілася з працэсам навучання дзяцей з рознымі парушэннямі слыху. Яна наведала навучальныя класы, сталярную майстэрню, мастацкі клас, дзе таленавітыя выхаванцы з дапамогай фарбаў і пэндзля адлюстроўваюць свае ўспрыманне свету. Азнаёміўшыся з выставай карцін, а таксама іншых работ, зробленых сваімі рукамі, Наталля Качанава адзначыла высокі мастацкі густ юных мастакоў і прапанавала арганізаваць выставу ў Савеце Рэспублікі.

Такая прапанова для выхаванцаў Ждановіцкай спецыяльнай школы-інтэрната стала сапраўдным падарункам. Аднак гэта яшчэ не ўсё. Спікер уручыла дырэктару навучальнай установы сертыфікат на набыццё дэманстрацыйнай навучальнай прылады «Разумнае люстэрка ArtikMe». Для кожнага дзіцяці быў падрыхтаваны салодкі падарунак. Выхаванцы, у сваю чаргу, падаравалі гасцей святочным канцэртам. Музычна-тэатралізаванае прадстаўленне «У гасцях у казкі» нікога не пакінула абыякавым.

«Сёння мы ўбачылі, што вы таленавітыя і цудоўныя хлопчыкі і дзяўчынкі, якія робяць усё для таго, каб наша краіна была прыгожай, — звярнулася Старшыня Савета Рэспублікі да дзяцей. — Вы павінны ведаць, што вы вельмі патрэбныя нашай краіне. Мы хочам, каб у кожнага з вас спраўдзіліся самыя запаветныя жаданні».

У размове з журналістамі Наталля Качанава прызналася, што сустрэча з дзецьмі вярнула яе ў дзяцінства. «Усё нязменна: мы радуемся гэтым святам, чакаем іх з нецярпеннем і, вядома, заўсёды рады быць у коле сяброў, — адзначыла яна. — А тут сабраліся менавіта сябры, якія робяць вельмі важную і патрэбную справу».

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што гэтая цудоўная акцыя — «Нашы дзеці» — па ініцыятыве Прэзідэнта праходзіць на працягу многіх гадоў. «Мы чакаем яе з нецярпеннем, бо хочам убачыць хлопцаў і дзяўчат, у якіх гараць вочы, — заўважыла спікер. — Хоць і на працягу года мы сустракаемся з імі, але ўсё роўна чакаем свята і верым, што ўсё будзе цудоўна і добра».

Па словах **дырэктара Ждановіцкай спецыяльнай школы-інтэрната Іны ВОЛЧАК**, на прыкладзе гэтай навучальнай установы можна ўбачыць, якую каласальную падтрымку дзяржава пастаянна аказвае дзецям. «Дзеці забяспечаны слыхавымі апаратамі, харчаваннем, яны атрымліваюць бясплатную адукацыю, наведваюць шматлікія гурткі, экскурсіі. Для нашых юных мастакоў адкрываюцца ўсе дзверы ў краіне, нашы спартсмены ўдзельнічаюць у спаборніцтвах — усё гэта клопат аб дзецях, — канкрэтызавала дырэктар. — У нас ёсць усё для таго, каб яны развіваліся».

**Вераніка КАНЮТА.**

Гуманітарны складнік

# Кнігі пра Кітай перададзены БДУ

**Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі праводзіць акцыю «Кнігі пра Кітай — моладзі Беларусі». Розным навучальным установам, дзе кітаістыка, кітайская мова займаюць сур'ёзнае месца, уручаюцца бібліятэчкі з некалькіх дзясяткаў кніг пра Кітай, гісторыю і культуру Паднябеснай, зборнікі мастацкіх твораў кітайскіх пісьменнікаў у перакладзе на беларускую і рускую мовы. Чарговым адрасам уручэння «кітайскай кніжніцы» стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Перадаючы бібліятэчку галоўнаму ўніверсітэту краіны, **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** расказаў пра тое, што за апошнія гады было выдадзена ў «Звяздзе» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. А гэта — і даследаванні палітолагаў, аналітыкаў, вучоных пра гісторыю і сучаснасць Кітая, серыя «Светлыя знакі: Паэты Кітая», у якой прадстаўлены пераклады на беларускую мову твораў Ду Фу, Ван Вэя, Лі Бо, Ай Ціна, Вэнь Ідо, Сюй Чжыма, Мэн Хаажаня, Ван Гачжэня, Лі Цынчжаа і іншых класікаў і сучасных паэтаў Кітая. Перакладчыкамі выступілі і кітаісты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, найперш — Алена Раманоўская, Дар'я Нечыпарук, Вераніка Жукавец, якія рыхтавалі падрадкоўнікі з арыгінала, а часам і самі выступалі ў ролі перакладчыкаў мастацкіх тэкстаў.

— У Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, — заўважыў **рэктар ВНУ доктар педагагічных навук Андрэй КАРОЛЬ**, прымаючы падарунак ад выдавецтва і кітайскага пасольства, — як мінімум тры выразныя адрасы, тры пляцоўкі, дзе гаспадарыць, займае годнае месца кітаістыка: Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя, філалагічны факультэт, дзе працуе кафедра кітайскай філалогіі, і факультэт міжнародных адносін БДУ. Мы спадзяёмся, што кнігі, перададзеныя «Звяздой», будуць у полі зроку найперш у межах гэтай прасторы. У нашым універсітэце на розных факультэтах, у розных структурных падраздзяленнях працуюць члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. Мяркую, што мы ў першую чаргу для пашырэння беларуска-кітайскіх літаратурных, кніжных сувязяў запросім прафесійных літаратараў. І ўвогуле будзем і надалей плённа супрацоўнічаць з Выдавецкім домам «Звязда».

**Сяргей ШЫЧКО.**

Па сутнасці

# Бяспека як паветра



Некалі пачуў вельмі цёплы выраз, здаецца, на беларускім радыё — «свята кожны дзень». А ці не так? Усміхнуўся сонейку альбо птушцы за акном, якая туліцца ў сцюжу бліжэй да чалавечага жытла, — і вось яна радасць. Але ж у жыцці, на жаль, не так. У Сёмуху мы не заўважаем цнатлівую зеляніну, улетку хаваемся ад сонечных промняў дома, а потым імкнёмся трапіць у падарожжа да замежнай спёкі, а ўзімку ўвогуле страцілі непаўторнае і незабыўнае адчуванне Каляд. Няўжо «Jingle Bells» заглушыў покліч палескіх калядоўшчыкаў? А памятаеце, як было хораша?

За простым сталом з чыстым абрусам, які накрываў ахапку саломы альбо сена, збіралася радня. А вакол цяпліня. Ці то ад печкі, ці то ад адносін паміж людзьмі. Традыцыйныя чарка і скварка, а потым разам з марозам у хату — калядоўшчыкі з батлейкай альбо Віфліемскай зоркай. Хораша. Цяпер стол больш багаты, а вось успрыманне больш прымітыўнае — не так узрушае. Хаця вакол прастора грае агеньчыкамі і навагоднімі матывамі. Напэўна, у вясковых цэрквах адчуванне свята больш адмысловае, аўтэнтычнае ў параўнанні з пампезнасцю сталічнага сабора. Галоўнае заўжды не вельмі заўважнае. А таму яго лёгка страціць.

Як не страціць незаўважную для звычайнага абывацеля (незаўважную, таму што дзейсную), але вельмі важную атмасферу бяспекі, арыентуе Прэзідэнт. Размова з кіраўнікамі органаў бяспекі краін СНД атрымалася вельмі шчырай. Як заўжды і бывае, калі гаворыць Аляксандр Лукашэнка. Яшчэ раз пра бенефіцыяраў міжнароднай ліхаманкі. Памятаеце, як мы падалей на паліцы паставілі кнігі Івана Шамякіна і Юрыя Бондарава? Памятаеце, як калісьці вялікі экран вучыў нас схіляць галовы перад «магутным Захадам»? Як замест Шцірліца героямі сталі Рэмба і агенты брытанскай разведкі?

Усім знаёмыя гэтыя бесцырымонныя жэсты бравых амерыканскіх хлопцаў. Нага за нагу і боты на стол. Не выціраючы гэтых самых ног, яны ідуць на Усход. Некалі важная Еўропа — ужо дыванок ля дзвярэй, дакладней, трамплін для зорна-паласатага паходу на Усход. Усё яшчэ не па зубах постсавецкая прастора. Беларусь трымаецца, як калісьці Брэсцкая крэпасць. «Беларускі балкон», клін у праекце Міжрэчча, суверэнная тэрыторыя ў шэрай зоне. «Неакучаныя месцы» для Лэнглі.

Менавіта геаграфічнае становішча і пазіцыя адкрытай падтрымкі Масквы — прычына такой пільнай увагі да нашай краіны. Гэта іх злуе і раз'юшвае. І амерыканцаў, і тых, хто чысціць ім боты, якімі яны спрабуюць патаптацца на нашай постсавецкай прасторы.

Зараз час гібрыдных войнаў — сукупнасці розных іспытаў. Ад эканамічных санкцый да выкарыстання калабарантаў — сучасных паліцаяў. Нязгодныя? Давайце разбірацца.

Гісторыя любых гарачых канфліктаў сучаснасці пачынаецца з «метадычкі Шарпа» і радыкальнага нацыяналізму. Самы небяспечны перыяд — выбары. Тады палітызавана ўся частка грамадства. Напярэдадні электаральнай кампаніі, а адзіны дзень галасавання ўпершыню будзе праходзіць у Беларусі, прыкметна ажывіліся як спецслужбы сумежных дзяржаў, так і марыянеткі заходніх інтарэсаў. Сябе гэтыя людзі называюць апазіцыяй. Апазіцыяй да мірнай рэчаіснасці. Тыя, хто абяцаў «мірныя перамены», цяпер крычаць, што трэба ісці на Беларусь вайной. На сваю Радзіму... Гэтак жа карцінна здымуць абутак, каб сфатаграфавацца ў белых шкарпэтках на «лавачцы пратэстаў», гэтак жа пераапрануцца ў натаўскую форму і пойдуць таптаць берцамі нашу зямлю. Гісторыя памятае такія прыклады.

Пакуль штандартэнфюрары цешылі свае музычныя рэцэптары сімфоніямі Шуберта, паходні да хатынскіх свіранаў падносілі якраз тыя самыя неверагодныя ненавіснікі свайго народа. Усе гэтыя паліцаі і харугвы толькі для гэтых мэт і створаны. Знішчаць і запалохваць. Мэты Захаду ў адносінах да нашай краіны ўвогуле не падтрымка эканомікі, а як і раней — змена канстытуцыйнага ладу і палітычнай арыентацыі. Раней было праз усмешкі і сустрэчы з уладамі, праз фонды, што фарміравалі пэўныя погляды ў грамадстве. І калі ў Беларусі ўсе зразумелі, то ў і іншых краінах яшчэ морак заходніцтва. Гэта нявывучаныя ўрокі Украіны.

Наглядны дапаможнік — працы замежных спецслужбаў па разбурэнні нашай агульнай прасторы, адзінага лёсу. Папярэджваў жа Прэзідэнт Зяленскага: і пра тое, што забудуцца, і пра канфлікты са сваімі ж вайскоўцамі. Так і атрымалася. Прапанова аб міры гучыць ізноў. Гэта сведчыць аб міласэрнасці Мінска. Чым хутчэй сціхнуць гарматы, тым больш людзей застануцца ў жывых.

Лукашэнка на саміце, Лукашэнка на заводзе — такая звыклая карцінка для нас. Як магілкі са сцягамі і Зяленскі з працягнутай рукой у заходніх сталіцах — для ўкраінцаў. Адно пытанне: хто зрабіў правільны выбар?

Беларускія і расійскія сілавікі за апошні час выкрылі не менш як дваццаць груп тэрарыстаў, якія планавалі атакі на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Асобныя дасюль не разумеюць сур'ёзнасці сітуацыі. Бяспека як паветра: пакуль чыстае, то не заўважаеш. Адчуваеш, як толькі сапсуецца. Варта цаніць тое, што мы маем.

Пад святочныя мелодыі ў гіпермаркетах, за простым сталом з чыстым абрусам альбо ў шумных рэстаранах беларусы будуць сустракаць мірны Новы год і Каляды. А калі і будуць неспадзяванкі, то толькі, можа, ад сцюжы. Але час паказвае, што мяккае ў нас нават надвор'е.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Сто найменняў падарункаў, сорак найменняў шампанскага

## Работа гандлю і грамадскага харчавання

У перадсвяточныя і святочныя дні па ўсёй тэрыторыі Беларусі па ўзгадненні з мясцовымі ўладамі будуць прадоўжаны рэжымы работы 350 гандлёвых аб'ектаў і 240 аб'ектаў грамадскага харчавання. Ужо цяпер у буйных крамах абвешчаны прыём папярэдніх заказаў ад насельніцтва на выраб мучных, кандытарскіх і іншых кулінарных вырабаў і паўфабрыкатаў.

Літаральна праз некалькі дзён будуць прымацца папярэднія заказы на абслугоўванне навагодніх і калядных свят, «агеньчыкаў» і карпаратываў. Паводле папярэдніх звестак, у святочных мерапрыемствах возьмуць удзел каля 110 тысяч чалавек.

Арыенціровачны кошт пераднавагодніх мерапрыемстваў — ад 150 да 200 рублёў. «У навагоднюю ноч гэта будзе крыху даражэй — каля 250 рублёў», — удакладніла Наталля Мельнікава. І дадала, што ў прыярытэце — якаснае абслугоўванне насельніцтва і стварэнне адчування свята. Так, на дадзены момант завершана работа па тэматычным афармленні вітрын, фасадаў, гандлёвых зал і іншых аб'ектаў, а таксама святочнае добраўпарадкаванне прылеглых да гандлёвых аб'ектаў тэрыторый.

## Навагодні асартымент

Асартымент навагодняй атрыбутыкі будзе налічваць каля 22 тысяч найменняў. Саладкіх навагодніх падарункаў будзе выпушчана 2,4 мільёна штук, парадку 100 найменняў — ад 300 грамаў да трох кілаграмаў. Цана падарункаў — ад 8 да 80 рублёў у залежнасці ад вагі і камплектацыі.

Для дарослых гандаль гатовы прадставіць больш за 40 найменняў пеністых він і шампанскага коштам ад 8 да 20 рублёў.

Паводле звестак гандлёвага міністэрства, ёлачных упрыгажэнняў і сувеніраў пакупнікам будзе прапанавана каля двух тысяч найменняў. Акрамя гэтага, прапануецца больш за 100 найменняў карнавальных касцюмаў, напрыклад Дзеда Мароза і Снягуркі.

## Перадсвяточныя акцыі

У перадсвяточныя і святочныя дні плануецца правесці больш за 12 тысяч такіх мерапрыемстваў. З іх больш за 9 тысяч — гэта распродажы, звыш 1 тысячы — рэкламныя акцыі, 360 дэгустацый, 140 рэкламных гульняў.

Усе буйныя гандлёвыя цэнтры краіны ўжо пачалі такія акцыйныя мерапрыемствы і працягнуць іх праводзіць да сярэдзіны студзеня.

## Ёлачныя базары

З 15 снежня таксама пачалі працаваць ёлачныя базары. Па краіне іх будзе арганізавана каля 950. Кошт елкі ў залежнасці ад рэгіёна і вышыні дрэва — ад 9 рублёў і больш. Елкі ў кадках будуць прадавацца па цане ад 20 да 30 рублёў, ёлачныя букеты — ад 4 рублёў.

Штучныя ёлкі ў крамах прадстаўлены па кошце ад 8 рублёў і больш (у залежнасці ад памеру дрэўца і прызначэння).

## Сталічныя запасы «кішэню не цягнуць»

Напярэдадні свят гандлёвыя кропкі Мінска рыхтуюцца да павышанага пакупніцкага попыту. Неабходныя таварныя запасы ўжо створаны. Пра гэта паведаміла **начальнік Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алена НАГОРНАЯ.**

Сярод іншага, у дастатковых аб'ёмах зарэзерваваны падарункі і сувеніры, пеністыя віны, кандытарскія, мясныя і каўбасныя вырабы, рыба і морапрадукты — словам, усё тое, што найбольш папулярна ў пакупнікоў падчас навагодніх і калядных свят.

У топе ў мінчан — рыбныя і мясныя тавары, кандытарскія вырабы айчыннай вытворчасці і яны у дастатку на паліцах крам. А акрамя гэтага, павышаецца попыт і на сувеніры: ёлачныя ўпрыгажэнні, падарачныя наборы.

Час павышанага попыту, як адзначыла Алена Нагорная, пачаўся з 20 снежня. У гэты час асобныя крамы будуць працаваць даўжэй.

— У буйных універмагах сталіцы і іншых гандлёвых аб'ектах працуюць спецыялізаваныя аддзелы, секцыі, дадатковыя месцы і зоны продажаў, дзе рэалізуюцца штучныя ёлкі, навагоднія ўпрыгажэнні і іншая святочная атрыбутыка, — расапавяла начальнік Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама. — Усяго ж прадстаўлена больш за дзве тысячы найменняў ёлачных упрыгажэнняў, сувеніраў, сфарміраваных падарункаў. Цэнавы дыяпазон шырокі. Акрамя таго, гандлёвыя залы і фасады аб'ектаў гандлю, а таксама прылеглыя да іх тэрыторыі атрымалі святочнае афармленне. Найбольш яркая ілюмінацыя — на праспектах і цэнтральных вуліцах сталіцы.

А ёлачныя базары ў сталіцы адкрыюцца 22 снежня. Набыць навагодняе дрэва можна будзе ва ўсіх раёнах, для чаго адвялі 68 пляцовак. Акрамя таго, каля буйных гандлёвых аб'ектаў горада з 20 снежня пачынаюць гандляваць самым галоўным навагоднім атрыбутам пачалі лясгасы. Пакупнікам прапануюць жывыя елкі, хвоі, піхты, ялова галіны і расліны ў кадках. Працаваць такія кірмашы будуць да 31 снежня ўключна (магчыма, што да 21.00—22.00).

Таксама па традыцыі ў сталіцы арганізуюць працу святочных кірмашоў. Цэнтральны з іх — «Калядны кірмаш» — адкрыўся 16 снежня і будзе дзейнічаць да 14 студзеня. Велізарная забаўляльная зона працуе каля Палаца спорту. Сярод іншага, тут можна пакаштаваць стравы беларускай кухні, пачаставацца гарачымі напоямі, набыць жывыя елкі. Арганізавана работа атракцыёнаў і іншых забаўляльных актыўнасцяў.

Ужо зараз на кірмашы праходзіць святочная праграма, якая ўключае прадстаўленне «Тэхнаелкі». «Гэта навінка бягучага года. Прэзентацыя такой елкі суправаджаецца канцэртнай праграмай», — патлумачыла спікер.

Акрамя таго, кірмашы пройдуць і ў раёнах сталіцы. Гараджан на іх чакаюць ужо ў гэтую суботу, 23 снежня.

Крыху раней, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў звярнуў увагу на той факт, што сталічны гандаль у навагоднія і калядныя святы павінен працаваць з улікам павышанага попыту не толькі з боку гараджан, але таксама і гасцей горада з іншых рэгіёнаў краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ДЗЕД МАРОЗ ПА ПРОЗВІШЧЫ АФАНАСЬЕЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сустрэцца з галоўным Дзедам Марозам раёна напярэдадні свята аказалася няпроста, графік у Юрыя Васільевіча шчыльны. Акрамя занятасці на асноўным працоўным месцы ў раскладзе мужчыны штодзень рэпетыцыі ранішнікаў, навагодняга шэсця, спектакляў і самой ночы на цэнтральнай плошчы. Кожны ў Шуміліне ведае Афанасьева не толькі як культурнага актывіста і надзейнага таварыша, але і як таго, хто дорыць навагоднія цуды, таму тут, у гарпасёлку, Новы год чакаюць асабліва моцна. І вераць, што дзядуля сапраўдны.

Шлях у мастацкую самадзейнасць у Юрыя Васільевіча пачаўся яшчэ ў мясцовай школе, калі настаўніца рускай мовы і літаратуры Раіса Рачкоўская запрасіла юнака ў драмгуртох. Першай спробай на сцэне для хлопца стаў спектакль «Конское прозвішча», потым была і знакамітая «Ноч перад Раством». А пасля таленавітага Юру заўважыў знакаміты ў шумілінскіх кругах рэжысёр Генадзь Ганчароў, які кіраваў мясцовым народным тэатрам. Менавіта ў далёкія 1990-я гады Афанасьеў першы раз прымераў на сябе ролю Дзеда Мароза, хоць тады ён іграў не дарослага, а аднаго з двух маладых Марозікаў. Уменне трымацца на сцэне і поўная аддача ролі зрабілі сваю справу — галоўны навагодні персанаж замацаваўся за Юрыем і за столькі гадоў моцна пераплёўся з ім самім.

Цікава, што гэта творчая асоба па спецыяльнасці ветэрынар, але большую частку свайго жыцця Юрый Васільевіч працуе начальнікам лабараторыі на ААТ «Вежа». «Калі мая культурная дзейнасць толькі пачыналася, я напярэдадні



Новага года браў на асноўнай рабоце водпуск, каб прысвяціць час рэпетыцыям і падрыхтоўцы. Зараз, канешне, напрацаваны вопыт дае магчымасць сумяшчаць працу і мастацкую самадзейнасць», — дзеліцца герой.

Вобраз Дзеда Мароза для мужчыны мае сакральны сэнс, таму штогод пры падрыхтоўцы да святочных мерапрыемстваў ён пільна падыходзіць на толькі да сцэнарыя, але і да касцюма. Гэтай калекцыі, калі можна так назваць казачны гардэроб, пазайздросціць любы дом культуры. Выконваючы ролю Марозіка першы раз, Юрый вырашыў пашыць свой касцюм. «Тады вялікіх фінансавых магчымасцяў не было, пазычыў 200 доларaў і заказаў у расійскім горадзе Іванава атласную чырвоную шубу. Потым набыў высакаякасны парык у сталічнай майстэрні, пасля з'явіліся і бліскучыя боты», — успамінае Юрый Васільевіч. Дарэчы, менавіта боты ў нейкай ступені прымусілі мужчыну сачыць за кожнай дэталлю вобраза, каб ні ў якім разе не сапсаваць дзецям веру ў казку. «Мая знаёмая павяла сваю дачку на ранішнік, а ў Дзеда Мароза з-пад шубы тырчалі чорныя штаны і лакавыя туфлі. Дзяўчынка расплакалася, свята было сапсавана. Дзед Мароз павінен быць апрануты правільна, па ўсіх казачных канонах. Дзеці — гэта самыя пераборлівыя гледачы, першасна яны ўспрымаюць героя вачыма, таму добры касцюм — гэта палова поспеху», — дзеліцца сакрэтамі Афанасьеў.

Менавіта таму зараз у гардэробе героя тры касцюмы сіняга і чырвонага колераў, сёлета пад заказ для Юрыя Васільевіча пашылі новае ўбранне. Пад кожную шубу — падыходзячыя па колеры атласныя шаравары, а яшчэ дзве пары бліскучых ботаў па індывідуальнаму пашыву. Якасная кучаравая барада — таксама важны элемент вобраза, яна замацавана надзейна, каб дзеці маглі пераканацца ў сапраўднасці дзядулі. А чаго вартыя чароўныя кіі Афанасьева: ёсць у калекцыі Юрыя і складны разьбяны з дрэва, ёсць і некалькі больш сучасных з ілюмінацыяй. Некаторыя свае касцюмы мужчына ўжо падарыў мясцовай школе і аддзелу культуры. Ён перакананы, што мясцовыя дзеці ні чым не горшыя за гарадскіх, таму для іх сівы чараўнік павінны быць прыгожым.

На плячах Афанасьева раней ляжалі амаль усе раённыя навагоднія мерапрыемствы — ад ранішнікаў у дзіцячых садках і школах да самой навагодняй ночы на цэнтральнай плошчы. З цягам часу заслужаны Дзед Мароз адышоў ад такога напружанага графіку, бо замяняць персанажа маглі маладыя спецыялісты культуры. А ў гэтым годзе Юрый Васільевіч зноў вярнуўся ў сваю нялёгкую каляіну. «Нягледзячы на пераднавагоднія спектаклі, першага студзеня ў 00:20 трэба ўжо быць на цэнтральнай ёлцы. Для кагосьці гэта складана — правесці святочную ноч не за сталом з шампанскім, а з людзьмі, а мне гэта прыносіць радасць. За снежань я напітваюся энергіяй дабра і пазітыву на цэлы год. Гэтыя эмоцыі не параўнаць ні з чым», — расказвае герой.

Самааддачу народнага артыста адчуваюць сэрцам дзеці. Многія пастаянныя прыхільнікі шумілінскага Дзеда Мароза спецыяльна прыходзяць з бацькамі ў навагоднюю ноч, каб падзякаваць чараўніку за сюрпрызы пад ёлкай, падзяліцца сваімі жаданнямі. Аднойчы Юрыю Васільевічу нават падарылі карціну, зробленую дзіцячымі рукамі. Яе, як адзін з галоўных напамінаў аб важнай і пачэснай місіі дарыць людзям цуд, Афанасьеў беражліва захоўвае.

Сёлета да ўсемагчымых раённых мерапрыемстваў дадалася яшчэ і работа ў раённай рэзідэнцыі Дзеда Мароза, якая больш за дзесяць гадоў таму была створана па ініцыятыве Юрыя Васільевіча і дырэктара раённага цэнтра культуры Марыны Прохаравай. Жаданне быць на пастаяннай сувязі з дзецьмі ў работнікаў культуры не мае граніц: у перыяд эпідэміі каронавіруса галоўны чараўнік разам са Снягуркай віншавалі малых у фармаце анлайн. А на наступны год работнікі цэнтра культуры плануюць арганізаваць навагоднюю пошту, праз якую дзеці змогуць дасылаць лісты свайму, мясцоваму Дзеду Марозу на вуліцу Паўночную. Там, дарэчы, працуе сам Юрый.

Увесь астатні год пасля навагодніх урачыстасцяў герой актыўна ўдзельнічае ў культурным жыцці гарпасёлка. Так, на працягу многіх гадоў Юрый з'яўляецца ўдзельнікам народнага фальклорнага калектыву «Гульбічы», які ў свае залатыя гады аб'ездзіў не толькі Беларусь, але і Польшчу, Прыбалтыку. Здольнасці вядучага мужчына выкарыстоўвае на мерапрыемствах цэнтра культуры, летам ён іграў Несцерку на абласным фестывалі гумару «Смяяцца не грэх». Але ўсё ж такі бліжэй да сэрца Юрыю Васільевічу роля Дзеда Мароза.

«За амаль 30 гадоў навагодняй дзейнасці мой вобраз ні разу не быў камерцыйным праектам, і я гэтага не разумею. Да сваіх «калег», якія могуць пакурыць праз бараду або падняць чарку ў ролі Дзеда, таксама стаўлюся негатыўна. Вобраз Дзеда Мароза нельга апашляць, ён павінен быць казачным і ў некаторай ступені святым», — разважае Афанасьеў.

Заўтра галоўны чараўнік раёна будзе запальваць агні на цэнтральнай ёлцы Шуміліна. Разам з другімі казачнымі персанажамі дзядуля пройдзе па галоўнай вуліцы гарпасёлка, будзе частаваць дзяцей цукеркамі з вялікага мяшка і слухаць самыя важныя жаданні. «Трэба несці радасць дзецям, няхай хаця б у іх усё будзе цудоўна», — рэзюмуе Юрый Васільевіч.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота з архіва героя.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
21 СНЕЖНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15968)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Элеанора КАЧАЛОЎСКАЯ:

# «Ты будзеш па-сапраўднаму прыгожы, калі ты шчаслівы»

**21 лістапада ў Неапалі адбыўся фінал конкурсу «Міс Еўропа Кантыненталь – 2023», нашу краіну на ім прадставіла пераможца «Міс Беларусь – 2023» Элеанора Качалоўская. Дзяўчына не толькі годна ўвасобіла прыгажосць Сінявокай, але і заваявала тытул першай віцэ-міс. Аб тым, як праходзіла падрыхтоўка да конкурсу, якія ўражанні пакінуў ён аб сабе, а таксама аб планах дзяўчыны на будучыню чытачы даведаюцца з сённяшняй гутаркі.**

***— Як змянілася ваша жыццё пасля конкурсу «Міс Беларусь»?***

— Напэўна, найбольш заўважна змяніўся графік і жыццёвы рытм. Цяпер у мяне максімальная ўцягнутасць у розныя мерапрыемствы, а яны ўсе разнапланавыя. Ну і, вядома ж, статус, у якім я іх наведваю. Калі раней была ў якасці гледача ці арганізатара, то цяпер мяне запрашаюць як ганаровага госця. Але, вядома, асноўнае, што я павінна выконваць, гэта ўдзельнічаць у міжнародных конкурсах і прадстаўляць на іх краіну.

***— А якія з мерапрыемстваў больш за ўсё «запалі ў душу»?***

— Гэта складанае пытанне. Кожнае было пасвойму ўнікальнае. Цяпер я актыўна наведваю гульні хакейнага клуба «Дынама». Яны запрасілі мяне на свой першы матч, а потым сама стала прыходзіць да іх. Я і раней любіла хакей, таму глядзець яго ўжывую прыносіць мне сапраўднае задавальненне. Таксама ў мяне зараз вялікая колькасць мерапрыемстваў сумесна з БРСМ. З апошніх, напрыклад, была закладка першага каменя на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Брэсцкай крэпасці. Таксама актыўна прымала ўдзел як госця ў конкурсе «Студэнт года». Калі казаць пра найбліжэйшую будучыню, то гэта, канешне ж, удзел у Прэзідэнцкім балі. А яшчэ нядаўна мяне запрасілі як «Міс Беларусь» у Гродзенскую вобласць у карэкцыйны цэнтр. Але я вырашыла паехаць у вобразе Снягуркі, знайшла сабе касцюм і нават Дзеда Мароза. *(Усміхаецца.)*

***— Ці займаецеся вы самі валанцёрскай дзейнасцю?***

— Я не магу назваць сябе паўнавартасным валанцёрам, аднак некаторую валанцёрскую дзейнасць усё ж вяду. Напрыклад, пад сваё «забеспячэнне» ўзяла «Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Воранаўскага раёна» і кобрынскіх валанцёраў, якія выкупілі дом і зрабілі прытулак для сабак.

***— Як прынялі рашэнне ўдзельнічаць у конкурсе «Міс Еўропа Кантыненталь – 2023»?***

— Да нас у Нацыянальную школу прыгажосці прыйшло запрашэнне адтуль, і, нядоўга разважаючы, мы яго прынялі. Насамрэч на падрыхтоўку пайшло вельмі мала часу, прыблізна крыху менш за месяц. Вельмі праблематычным было лагістычнае пытанне. У Еўропу трапіць прамым рэйсам немагчыма. Складана было разлічыць лагістыку самалётаў, у мяне была перасадка, начное пражыванне ў перасадачным пункце. Цяжка было разлічыць хвіліна ў хвіліну дзе, як і ў колькі мне трэба быць, каб паспець у канкрэтнае месца. У выніку на конкурс я паехала адна, што пакінула пэўны след у маёй падрыхтоўцы і адбілася на маім багажы.

***— Апроч вырашэння арганізацыйных пытанняў, як яшчэ праходзіла падрыхтоўка да конкурсу?***

— Я больш часу стала надаваць вывучэнню англійскай мовы. Таксама ў мяне быў псіхолаг. Не магу сказаць, што было вельмі шмат сеансаў, але яны, бясспрэчна, дапамаглі. Паколькі я літаральна з аднаго маштабнага конкурсу адразу паглыбілася ў іншы, ды яшчэ і ўдалечыні ад дома знаходзілася, таму было псіхалагічна цяжкавата. Ды і тое, што я ляцела адна, таксама крыху палохала. Акрамя гэтага, у мяне з'явіўся асабісты стыліст, якая распрацавала мне прычоскі і макіяж на кожны дзень. Разам з ёю мы хадзілі закуплялі касметыку. Увогуле можна сказаць, што я прайшла такі экспрэс-курс. І гэта вельмі спатрэбілася. На конкурсе мы па факце «збіралі» самі сябе, акрамя фінальнага дня, і я выкарыстоўвала атрыманыя ад стыліста навыкі напоўніцу.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*




Не вучобай адзінай

## ПРАЙСЦІ ПРАЗ ТРАНСФАРМАЦЫЮ

### Як гэта атрымалася ва ўдзельнікаў конкурсу «Студэнт года — 2023»

**Мноства маладых людзей з маляўнічымі плакатамі, гучныя авацыі і яркае запальнае шоу з нязменным духам спаборнасці... Менавіта такая атмасфера была ў Мінскім гарадскім палацы культуры падчас гранд-фіналу рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2023».**

Сёлета мерапрыемства было падзелена на два конкурсныя дні. Напачатку фіналісты абаранялі свае «курсавыя» праекты, якія ў перспектыве могуць рэалізавацца на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях, і дзяліліся натхняльнымі гісторыямі са свайго жыцця падчас «Конкурсу прамоўніцкага майстэрства».

У асноўны конкурсны дзень, нягледзячы на тое што да мерапрыемства заставалася больш за гадзіну, хол ужо быў перапоўнены моладдзю. Тым не менш у натоўпе лёгка было пазнаць фіналістаў па спецыяльным брэндаваным адзенні. Цікава, аб чым яны думаюць напярэдадні выступлення?



Падыходзім да другакурсніцы факультэта маркетынгу, менеджменту, прадпрымальніцтва БНТУ Арыны Колесавай. Дзяўчына адразу ж запэўніла нас, што для яе перамога не самамэта:

— Адзінае, пра што я думаю зараз, — гэта як прадставіць свой творчы нумар годна, — падзялілася яна. — Пра свае шанцы на перамогу буду думаць ужо пасля выступлення. Цяпер нешта прадказаць вельмі складана.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

У ліку найлепшых

## ПА ПЛЯЧЫ І МЕГАШКОЛА, І ТАЙГА,

### або «Тытан» ніякіх цяжкасцяў не баіцца!

**Студэнт Магілёўскага Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Іван ІВАШКОЎ прызнаецца, што адчуў сапраўдны гонар, калі пры падвядзенні вынікаў працоўнага семестра ў Мінску менавіта яго ВНУ тройчы была адзначана. Гэта ж трэба было так супасці, каб найлепшымі на ўсю краіну сталі адначасова штаб працоўных спраў універсітэта, яго атрад «Тытан» і ён сам як камандзір!**

Наогул, Іван *(на здымку справа)* лічыць сябе шчаслівым чалавекам. Пяць гадоў таму ён стаў студэнтам прэстыжнага будаўнічага факультэта БРУ і атрымаў такую падрыхтоўку, якая стала моцным падмуркам у яго жыцці. Дарэчы, у студэнцкія будаўнічыя атрады маладых чалавек ездзіць з другога курса — 2021 года. Першай была маладзёжная будоўля на Беларускай АЭС у Астраўцы.

— Пасля першага курса прапанаваў аднагрупнікам скласці мне кампанію для паездкі ў студатрад, — расказвае ён. — Мауляў, навошта сядзець летам дома, калі ёсць магчымасць дзесьці пабываць і нават грошай падзарабіць. Хлопцы мяне падтрымалі і... выбралі камандзірам. Так што гэтыя абавязкі я выконваю са свайго першага працоўнага семестра.

Малады чалавек прызнаецца: тая паездка запомнілася тым, што вельмі шмат працавалі. Работа цяжкая, будаўнічая — пасля сіл мала ўжо на што заставалася. Хоць было шмат прапаноў на ўдзел у мерапрыемствах, экскурсіях. Працавалі плячо ў плячо з хлопцамі з расійскага будатрада «Квант». Узаемаадносіны былі хоць і дзелавыя, але ж сяброўскія.



— А як прыемна потым было трымаць у руках зароблены мазалямі і потам грошы, — усміхаецца Іван. — Гэта пачуццё нельга параўнаць ні з якім іншым. А заробак быў салідны. Падаткамі тыя даходы абкладаліся па мінімуме. Калі вярнуліся дамоў, то ўжо ведалі, што налета паедзем ізноў. Гэта свайго кшталту рамантыка, якая захоплівае і цалкам паглынае.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*Даніна пашаны*

# ЗДАЦЬ «СЕСІЮ ЖЫЦЦЯ» Ў КРЭПАСЦІ

**«Усебеларуская маладзёжная будоўля служыць асновай адзінства і згуртаванасці беларускага грамадства». Такую думку выказаў рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ падчас удзелу ў будаўніцтве Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці.**



Ён далучыўся да студэнцкага атрада БДУ «Аэліта» імя А. Н. Сеўчанкі і разам з хлопцамі працаваў у падвальных памяшканнях па ачыстцы старой каналізацыі ад будаўнічага смецця і пяску. У найбліжэйшы час адтуль трэба будзе вынесці каля 400 тон пяску.

Падчас будаўнічых работ рэктар адзначыў значнасць аб'екта, які ўзводзіцца. «Тут кожны сам сябе фарміруе, успрымае гістарычную атмасферу і праз працу і пераадоленне глядзіць на многія рэчы пад іншым ракурсам. Вобразна кажучы, здае «сесію жыцця». Брэсцкая крэпасць з'яўляецца не проста іміджавым складнікам Беларусі. Гэта цэласны комплекс сусветнай спадчыны, таму стварэнне на гэтым месцы цэнтра патрыятычнага выхавання — сімвалічная даніна мінуламу, мужнаму і самаадданаму служэнню Айчыне, — разважае Андрэй Кароль. — Усебеларуская будоўля служыць асновай адзінства і згуртаванасці беларускага грамадства, яго гатоўнасці далучаць моладзь да сваёй гістарычнай спадчыны. Толькі ў гісторыі, якую памятаюць і шануюць, ёсць сучаснасць і будучыня для любой краіны».

Наведванне аб'екта працягнулася экскурсіяй па гісторыка-культурным комплексе. Актывісты БДУ расказалі рэктару пра ўмовы пражывання, паказалі асноўныя будаўнічыя пляцоўкі і падзяліліся сваімі дасягненнямі. Па словах хлопцаў і дзяўчат, за гэты перыяд яны ачысцілі падвальныя і паддашкавыя памяшканні ад смецця, правялі дэмантаж тынкавачнага матэрыялу. За тыдзень бесперапыннай працы 15 студэнтаў змаглі стварыць сяброўскую атмасферу і адшукаць сакрэт зладжанай і эфектыўнай працы. «Уся справа ў планаванні», — у адзін голас заявілі маладыя людзі.

Дарэчы, яны ўстанавілі асабісты рэкорд: за 16 хвілін змаглі вынесці з гарышча 2000 кілаграмаў смецця. Загадзя выпрацаваныя і прадуманыя дзеянні і іх дакладнае выкананне, па словах актывістаў, дапамагаюць вырашаць складаныя задачы. «Праца патрабуе сілы і настойлівасці, а таксама правільнага размеркавання часу. Прызвычаіцца да такога графіка ў нас атрымалася не адразу, але ўжо бачны вынік», — распавёў камандзір атрада, трэцякурснік юрыдычнага факультэта Андрэй Маліноўскі.

На рэспубліканскай будоўлі працуюць не толькі беларускія хлопцы. Першакурснік факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Тамерлан Сулкін расказаў, што яшчэ нядаўна жыў у расійскай сталіцы, а ўжо сёння ўносіць свой уклад у захаванне гістарычнай памяці беларускага і расійскага народаў. «Мае прадзядуля і дзядуля вельмі шмат расказвалі пра Брэсцкую крэпасць і пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Я сам неаднаразова прыязджаў сюды на экскурсіі. Таму, знаходзячыся тут, адчуваю вялікі гонар і аддаю даніну памяці нашым гераічным продкам», — кажа студэнт.

Грамадска значная праца і высокая ідэя сталі імпульсам для ўдзелу ў працоўнай дзейнасці чацвёртакурсніка гістарычнага факультэта Андрэя Кучары. «Я рэканструктар, працую з перыядамі Першай і Другой сусветных войнаў. Таму мне цікава паглядзець на працэс гістарычнай рэканструкцыі знутры. Безумоўна, адчуваю гонар за тое, што дакрануўся да Усебеларускай маладзёжнай будоўлі і прыклаў руку да захавання гістарычнай спадчыны», — прызнаўся малады чалавек.

Нагадаем, Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі — не першы аб'ект Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. У 2014 годзе такі статус быў нададзены аб'ектам Беларускай атамнай станцыі, а з 2019-га — будынкам сацыяльнай інфраструктуры ў Астраўцы. Таксама ў мінулым годзе такі ж статус атрымала рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

Студэнцкі атрад «Аэліта» быў заснаваны ў 1965 годзе на базе фізічнага факультэта пад кіраўніцтвам рэктара БДУ Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі. Гісторыя яго стварэння звязана з часам студэнтаў-рамантыкаў. У прыватнасці, для многіх маладых людзей фантастычны раман А. М. Талстога «Аэліта» не проста ўяўляў адмысловую цікавасць, але і ўтрымліваў узнёслыя намеры і ідэалы, а значыць, падыходзіў на ролю «сцяга» для студэнцкага руху. Цяперашнія байцы-актывісты вырашылі аднавіць сімвалічнае імя атрада і «падарыць» яму новыя мэты, задачы і заслугі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота прэс-службы БДУ.**

*Новыя старты*

# ПРАВАВАЯ АСВЕТА ПРАЗ ТУРНІР

## Упершыню пройдзе інтэлектуальна-творчы конкурс эсе

**21 снежня ў Мінску адбудзецца фінал III Рэспубліканскага прававога турніру «Сіла закона» для вучняў 9—11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У час раённых і рэгіянальных этапаў турніру ў інтэлектуальных спаборніцтвах на веданне законаў маладой і незалежнай Беларусі прынялі ўдзел 29 815 школьнікаў. Старшакласнікі індывідуальна адказвалі на тэставыя заданні па тэме «Народаўладдзе ў Рэспубліцы Беларусь. Традыцыі, сучаснасць, будучыня».**

У сталіцы юныя інтэлектуалы права будуць змагацца за перамогу ў трэцім, заключным, туры прававога турніру — 21 школьнік. Гэта хлопцы і дзяўчаты, якія набралі найбольшую колькасць балаў у рэгіёнах у сваіх узроставых катэгорыях (па тры чалавекі).

Пасля ўрачыстай цырымоніі афіцыйнага адкрыцця рэспубліканскага прававога турніру «Сіла закона» фіналісты накіруюцца ў спецыяльна абсталяваныя аўдыторыі юрыдычнага факультэта БДУ, дзе паспаборнічаюць у першай частцы фіналу — анлайн-тэсціраванні.

На Дзіцячым прававым сайце за пэўны час (не больш за 30 хвілін) ім трэба праявіць веды разам з інтэлектам, упартасць і мэтанакіраванасць, адказваючы на 20 тэставых заданняў, якія датычацца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, выбараў дэпутатаў розных узроўняў, Усебеларускага народнага сходу і інш.

У другой частцы фіналу арганізатары адвялі ўдзельнікам не больш за 60 хвілін на невялікае сачыненне свабоднай формы. Варта падкрэсліць, што інтэлектуальна-творчы конкурс эсэ ўпершыню ўключаны ў фінальную частку праграмы. Аўтарам эсэ дадзена магчымасць выказаць асабістыя ўражанні і думкі па зададзенай тэме (яна будзе агучана перад пачаткам другога выпрабавання). Дадатковыя патрабаванні — аб'ём творчай работы да 2000 знакаў з прабеламі.

За кожнае правільна выкананае заданне першага тура фіналісты могуць атрымаць адзін бал (усяго 20), за эсэ — 20, пры гэтым журы ўлічыць стыль і лагічнасць выкладання, паўнату адказу, аргументацыю пазіцыі, арыгінальнасць прапанаваных рашэнняў пытання, ступень валодання юрыдычнай прафесійнай лексікай.

Мэтапалаганне рэспубліканскага прававога турніру накіравана на фарміраванне найважнейшых элементаў сістэмы грамадзянска-прававога выхавання школьнікаў — прававую асвету, павышэнне цікавасці старшакласнікаў да заканадаўства, прапаганду прававой культуры.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПА ПЛЯЧЫ І МЕГАШКОЛА, І ТАЙГА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Хлопцы сябе вельмі добра зарэкамендавалі і на наступны год атрымалі ад штаба працоўных спраў пуцёўку ў Якуцію — на міжнародную студэнцкую будоўлю «Поўнач» — Чаяндзінскае нафтагазакандэнсатнае радовішча. У край алмазаў, шаманаў і экстрэмальна нізкіх тэмператур ляцелі, лічы, тым жа саставам. А Іван ізноў у якасці камандзіра.



— Запомніўся кур'ёзны выпадак, — усміхаецца ён. — Прыляцелі мы ў Якуцію і ўсім атрадам падстрыгліся пад машынку з насадкай. Там, дзе працавалі, цырульняў наогул не было. Тысячы кіламетраў тайгі. Падрыхтоўвалі прылеглую тэрыторыю да нафтаздабычы для «Газпрама», уладкоўвалі дапаможныя сродкі забеспячэння. Гэта быў зусім іншы вопыт.

Наступная паездка была не менш прыбытковай. Хлопцы засталіся задаволеныя сваімі заробкамі. І сёлетнім летам зноў падалі заяўкі, каб паехаць у студатрад.

— Работай мы займаемся, мякка кажучы, не жаночай. Гэта ў асноўным будоўля, добраўпарадкаванне, — удакладняе суразмоўнік. — У складзе будатрада выключна хлопцы, ад 16 да 20 чалавек. Наш плюс у тым, што мы мабільныя. Але галоўнае — мы адпавядаем сваёй назве і не баімся цяжкасцяў. І нашы пажаданні ў падборы пляцовак для прыкладання сіл улічваюцца. Гэтым летам мы два месяцы правялі на будаўніцтве самай буйной у Расіі мегашколы на 2800 навучэнцаў у Варонежы, а ў верасні зноў наведалі БелАЭС.

Малады чалавек прызнаецца, што званне найлепшага камандзіра студэнцкага атрада для яго вельмі адказная ўзнагарода. І вялікая радасць для бацькоў. «Стаць найлепшым мне дапамог той вопыт, які я атрымаў за тры гады, а таксама матывацыя, разуменне і ўзаемавыручка сяброў, — кажа суразмоўнік. — У нас ніколі адказнасць не перакладваецца на кагосьці аднаго. Мы працуем разам і адказваем, калі што, разам. А навічкоў вучылі, паказвалі, як трэба рабіць, падказвалі, дапамагалі. Улічваліся паказчыкі за тры гады нашых студатрадаўскіх паездак, перамогі ў асобных намінацыях праектаў, у якіх мы ўдзельнічалі. У Варонежы, напрыклад, мы выйгралі намінацыю «Найлепшы будаўнічы атрад па вытворчых паказчыках». Канкурэнцыю нам складалі студэнцкія атрады з Разані, Варонежа, Тамбова, Масквы. І прыемна было, што менавіта мы сталі першыя па вытворчых паказчыках. У нас там, як і паўсюль, на першым месцы была работа. Арганізацыя, якая нас прымала ў Варонежы, нават даслала падзячныя лісты. А вось на творчыя мерапрыемствы сіл не хапала. Хоць конкурсы і такія былі. Але мы там не перамагалі» *(усміхаецца).*




Па выніках сёлетняй работы ў Астраўцы Іван Івашкоў стаў найлепшым камандзірам праекта, а атрад па сукупнасці ўсіх паказчыкаў падняўся на другую прыступку. Хлопцы выканалі вялікі аб'ём работ, і працадаўца гэта ацаніў.

На пытанне, як збіраецца патраціць грошы, у Івана спрацоўвае руплівы гаспадар, які адказвае, што яны яму спатрэбяцца для ажыццяўлення планаў. Застаецца апошні курс, і бывай студэнцкае жыццё разам са студатрадаўскай рамантыкай. Будучы інжынер-будаўнік аўтамабільных дарог глядзіць наперад упэўнена. І не сумняваецца, што атрыманы вопыт яму абавязкова спатрэбіцца.

— Універсітэт дае магчымасць праявасці маладосць цікава, у тых жа будатрадах адчуць сябе самастойным, калі ты сам прымаеш рашэнні і цалкам клапоцішся і пра сябе, і пра сваіх таварышаў, — кажа Іван. — Цудоўна, калі разумееш, што знайшоў аднадумцаў.

«Мая байцоўка — як карта, на ёй шаўроны праектаў, дзе мы ўдзельнічалі, штаба працоўных спраў БРУ, нашыўка нашага будатрада. Шмат значкоў з розных форумаў. Але самае дарагое для мяне на гэтай байцоўцы — шаўрон камандзіра. Мая запаветная мара — адбыцца ў жыцці і ні ў чым не мець патрэбы. Універсітэт, акрамя вучэбнай базы, даў шмат жыццёвых установак, якія вельмі моцна змянілі тое мысленне, якое было ў мяне пасля школы. Я навучыўся мысліць не прамалінейна, а шукаць выйсце з любых сітуацый», — падсумоўвае камандзір «Тытана».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота дадзены героем.**

*Лакацыі актыўнасці*

# ДОБРЫХ ІДЭЙ ШМАТ НЕ БЫВАЕ!

**Больш чым 1300 заявак ад маладых наватараў розных узроставых катэгорый паступіла для ўдзелу ў 13-м сезоне рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі». Афіцыйны старт новаму сезону конкурсу быў дадзены 14 лістапада ў Мінску на базе навучальнага цэнтра холдынга «Гарызонт».**

Прыём заявак вёўся выключна праз сайт 100ideas.by. Цяпер аргкамітэт вывучае прапановы, якія паступілі. Усе яны праходзяць экспертызу. Па яе выніках будзе сфарміраваны банк аўтарскіх праектаў для ўдзелу ў занальных і раённых турах, паведамілі ў ЦК БРСМ.

Практычна штодня ў снежні па ўсёй краіне праходзяць унутрывузаўскія, раённыя і занальныя адборачныя туры. У Брэсцкай вобласці запланавана 18 раённых адбораў, у Віцебскай — 21, у Гомельскай — чатыры занальныя і адзін гарадскі, у Гродзенскай — пяць занальных. У Мінскай вобласці пройдзе чатыры занальныя адборачныя туры і адзін раённы. У сталіцы — дзевяць раённых адборачных тураў. У гэты ж перыяд адборы стартавалі ва ўстановах вышэйшай адукацыі і ўстановах і арганізацыях, падпарадкаваных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Акрамя таго, запланаваны дзесяць міжвузаўскіх адбораў. Для падрыхтоўкі аўтараў да ўдзелу ў наступных ступенях будзе арганізавана больш за 100 спецыялізаваных навучанняў па пытаннях стварэння прэзентацый, прасоўвання і рэалізацыі маладзёжных распрацовак.

У студзені чакаюцца рэгіянальныя адборы, а таксама адборы Міністэрства адукацыі і НАН Беларусі. Асноўныя намінацыі праекта — «Энергетыка, у тым ліку атамная энергетыка, і энергаэфектыўнасць», «Аграпрамысловыя тэхналогіі і фермерства», «Прамысловыя і будаўнічыя тэхналогіі», «Ахова здароўя (медыцынскія тэхналогіі, фармацыя, бія- і нанаіндустрыя)», «Хімічныя тэхналогіі, нафтахімія», «Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі», «Экалогія (рацыянальнае прыродакарыстанне і глыбокая перапрацоўка прыродных рэсурсаў)», «Нацыянальная бяспека і абарона ад надзвычайных сітуацый», «Грамадства і сацыяльная сфера», «Найлепшая бізнес-ідэя».

Праект «100 ідэй для Беларусі» рэалізоўваецца Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі сумесна з Мінадукацыі, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях у мэтах актывізацыі інавацыйнага мыслення моладзі, прыцягнення яе да вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, стымулявання грамадзянскіх ініцыятыў да рэалізацыі інавацыйных праектаў і навукова-тэхнічных распрацовак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПРАЙСЦІ ПРАЗ ТРАНСФАРМАЦЫЮ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Не хваляваццa перад выхадам на сцэну немагчыма. Аднак, як аказалася, з гэтымі перажываннямі фіналістам дапамог справіцца першы конкурсны дзень. Так, студэнт эканамічнага факультэта Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Іван Осіпаў прызнаўся, што эмоцыі зашкальвалі падчас прамоўніцкага конкурсу.

— Сёння ўжо «адпусціла», здаецца, я прывык да сцэны. Што будзе, тое будзе, — з усмешкай сказаў малады чалавек.

Варта адзначыць, што сёлета ў конкурсе ўдзельнічала рэкордная колькасць фіналістаў за ўсю яго гісторыю: ажно 18 чалавек! Лейтматывам «Студэнта года — 2023» стаў слоган «Шлях да трансфармацыі».

Па словах кіраўніка праекта Уладзіслава Дубіцкага, гэтая канцэпцыя прасочваецца ва ўсім: ад конкурсу, які за ўвесь час прайшоў мноства змен, да новых падыходаў у рабоце і стварэння творчых нумароў фіналістаў.

...Хутка пачалося шоу. Феерыя візітовак, канцэптуальных дэфіле і творчых нумароў. Фіналісты не пераставалі здзіўляць. У кожнага была свая ўнікальная ідэя. Напрыклад, Аляксей Перхальскі прадставіў сябе праз уласнае шоу і тэатр ценяў, Іван Осіпаў — праз рэп, а Анастасія Кісель — праз шахматныя фігуры, якія абазначалі розныя сферы яе жыцця. Не абышлося і без адсылак да трэндаў. У нумарах Анастасіі Шугалей і Паліны Арцёмчык прасочвалася тэматыка ружовага барбі-свету. Толькі вось у апошняй дзяўчыны гэта было пададзена асаблівым чынам. Фіналістку вынеслі ў скрыньцы з надпісам «Барбі». Спачатку здавалася, што ўсё закруціцца ў тым жа духу, як і ў Анастасіі Шугалей, і нумар страціць унікальнасць. Але не. Нечакана музыка спыняецца і дзяўчына кажа: «Стоп, гэта не наша гісторыя!» У момант дэкарацыі на сцэне мяняюцца. І зараз ужо перад гледачамі каробка з надпісам «Паўлінка», а фіналістка кружыцца ў нацыянальным касцюме ды яшчэ і Янку Купалу цытуе.

Творчыя нумары ўразілі сваёй прафесійнасцю. Як быццам бы выконвалі іх не студэнты, а дасведчаныя артысты. Кранулі нумары на тэму Вялікай Айчыннай вайны Аляксандры Шведавай і Паўла Кротава. Адна тэма, але пададзена абсалютна па-рознаму. Аляксандра разам з іншымі дзяўчатамі ў паўзмроку выканала танец, які літаральна быў прасякнуты болем жанчын, у якіх вайна бязлітасна забірае мужоў, сыноў і братоў. Гэта было моцна і вельмі канцэптуальна.





У Паўла падача была іншая. Нумар быў разбіты на некалькі эпізодаў. Спачатку ўсё добра. Мірны час. Ён, малады салдат, кружыцца ў танцы з каханай дзяўчынай. Здавалася б, усё жыццё яшчэ наперадзе, але, на жаль, героя забіраюць на фронт, і праз нейкі час каханай прыходзіць «пахаванка». Усё гэта было вельмі артыстычна выканана на сцэне. Завяршыўся нумар тым, што з залы выйшлі дзяўчаты са свечкамі, і настала хвіліна маўчання.

Безумоўна, былі і лягчэйшыя па ўспрыманні нумары, але не менш таленавітыя. Напрыклад, танга ў выкананні Уладзіслава Уголева заражала палымянай энергетыкай. А голас Юліі Левінай уражваў сваёй меладычнасцю.

Як жа выбраць сярод усіх гэтых талентаў найлепшых? Перамогі былі вартыя ўсе. Работа журы была нялёгкай, аднак па выніках іспытаў «Студэнтам года — 2023» стала прадстаўніца Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Анастасія Кісель. Другое месца дасталося студэнтцы Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Юліі Левінай. Трэцяе падзялілі паміж сабой Уладзіслаў Уголеў з Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта і Аляксей Перхальскі з Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. Да таго ж у дадатковай намінацыі — «Студэнт года ONLINE» — атрымала перамогу другакурсніца Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Арына Колесава.

...Праз пару хвілін пасля аб'яўлення вынікаў сцэна напоўнілася моладдзю з групы падтрымкі. Ажыятаж быў, вядома, каля пераможцы.

— Я вельмі шчаслівая, што прадстаўляю сваю родную ВНУ. І мяне перапаўняюць эмоцыі! — падзялілася дзяўчына. — На конкурс «Студэнт года» я марыла трапіць, яшчэ будучы абітурыенткай, і цяпер разумею, што ўсё не дарма, што ўся наша праца праведзена з вялікім класным вынікам!

Анастасія Кісель займаецца творчасцю, навукай, вакалам і танцамі. Сакрэт поспеху, па меркаванні дзяўчыны, — ва ўменні сумяшчаць усе таленты ў адным нумары, а таксама ў камандней працы.



**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

*Навука «ў полі»*

## На запасных «рэйках»

**Беларуская чыгунка і БРСМ падвялі вынікі працоўнага семестра 2023 года і намецілі планы па арганізацыі работы студатрадаў на магістралі ў 2024 годзе.**

У 2023 годзе ў арганізацыях дарогі працавалі больш за 650 студэнтаў і навучэнцаў з больш як 30 вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі. Яны шчыравалі правадніками пасажырскіх вагонаў і манцёрамі пуці, цеслярамі і малярамі, выхавацелямі і інструктарамі ў дзіцячых аздараўленчых лагерах.

У рамках нарады быў адзначаны высокі ўзровень арганізацыі работы студатрадаўцаў на Беларускай чыгунцы, вызначаны парадак і ўмовы прафесійнага навучання студэнтаў і навучэнцаў устаноў адукацыі краіны для працы ў складзе чыгуначных студэнцкіх атрадаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Бачыць мэту*

## ІНАВАЦЫІ ДЛЯ РЭАЛЬНАГА СЕКТАРА

**У сталіцы адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў 2023 года.**

У гэтым годзе Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь пры ўдзеле Міністэрства адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускага інавацыйнага фонду, грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» арганізаваў правядзенне Рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў у 14-ы раз.

Усяго было пададзена 168 заявак, у тым ліку ў намінацыі «Найлепшы інавацыйны праект» — 72, у намінацыі «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект» — 96. У фінал выйшла 40 праектаў, аўтары якіх выступілі з прэзентацыямі перад саветам конкурсу.

У кожнай намінацыі былі выбраны адзін пераможца і пяць прызёраў. Аўтары гэтых праектаў былі ўзнагароджаны каштоўнымі прызамі і грашовымі прэміямі ў памеры ад 1073 да 3182 рублёў. Сярод пераможцаў і прызёраў конкурсу адабраны пяць праектаў для далейшай камерцыялізацыі, кожны з якіх атрымае сертыфікат на суму 21 127 рублёў, што дазволіць укараніць у эканоміку краіны найбольш перспектыўныя інавацыйныя распрацоўкі.

Большасці праектаў, якія выйшлі ў фінал, будзе аказана экспертная падтрымка з боку членаў савета конкурсу і арганізацый-партнёраў (акселерацыя, трэкерства, кансультацыі экспертаў, падтрымка з мэтай абароны інтэлектуальнай уласнасці).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Андрэй ДЗМІТРУК:

# «КРОК ЗА КРОКАМ ВУЧУСЯ БЫЦЬ КІРАЎНІКОМ»

## Пераможца «Педагагічнага дэбюту» — пра сваю каманду і ўменне матываваць



**«Мне здаецца, што шчаслівае дзяцінства — адзін з самых вялікіх поспехаў у жыцці чалавека, — кажа загадчык мінскага дзіцячага сада № 252 Андрэй ДЗМІТРУК. — Дзяцінства — гэта ўнікальны час, калі ашчаслівіць цябе могуць мыльныя бурбалкі, зробленыя з шампуню ў ваннай. Гэта час, калі для таго, каб пабудаваць дом, табе дастаткова двух крэслаў і коўдры, а грошы лёгка можа замяніць сабранае ў парку лісце. Гэта цудоўная пара, калі бацькі маладыя і поўныя сіл, а для шчасця табе дастаткова любімага марожанага. Свет здаецца неабсяжным, каляровым, а да зорак можна дацягнуцца рукой. Пагадзіцеся, стаўшы дарослымі людзьмі, кожны з нас не раз прыгадваў сваё дзяцінства з добрай, шчымлівай усмешкай і падзякай, марыў хоць на дзень вярнуцца ў гэты незабыўны час...»**

**Праз дзесяць дзён мы ўсёй краінай будзем падводзіць вынікі адыходзячага года і сустракаць новы. Для нашага героя «Плеяды маладых» 2023 год, безумоўна, запомніцца перамогай у Рэспубліканскім фестывалі «Педагагічны дэбют». Фестываль праводзіўся ў краіне ўпершыню, але мае ўсе шанцы стаць традыцыйным. У цэнтры ўвагі апынуліся маладыя настаўнікі, выхавальнікі дашкольных устаноў, маладыя дырэктары школ і маладыя загадчыкі ўстаноў дашкольнай адукацыі. Удзельнікі павінны былі адпавядаць некалькім крытэрыям: узрост — да 31 года і стаж работы на пасадзе — не больш як пяць гадоў, незалежна ад кваліфікацыйнай катэгорыі.**

### Капітан карабля

Звяртаючыся да канкурсантаў, намеснік міністра адукацыі Аляксандр Кадлубай канстатаваў: «Маладосць — гэта адначасова і перавага, і недахоп, таму што яна хутка праходзіць. Дык цаніце яе, не бойцеся праяўляць наватарства, смеласць, таму што ў вас пакуль адсутнічае закасцянеласць педагагічнага мыслення, уласцівая больш старшым вашым калегам».

— Прыняць удзел у фестывалі мне прапанавалі ва ўпраўленні адукацыі Кастрычніцкага раёна Мінска. Мой агульны стаж у прафесіі — дзесяць гадоў. Але загадчыкам дзіцячага садка я працую толькі два гады. Некаторы час быў намеснікам загадчыка ў дзіцячым садзіку № 327. Конкурс расцягнуўся на цэлых дзевяць месяцаў, — расказвае Андрэй Дзмітрук. — Спачатку праходзілі раённыя, абласныя і Мінскі гарадскі этап, які прыраўноўваецца да абласнога. Затым быў завочны рэспубліканскі этап, падчас якога загадчыкі ўстаноў дашкольнай адукацыі пісалі эсэ і метадычную распрацоўку пасяджэння педагагічнага савета. Я прысвяціў эсэ сваёй маці.

У верасні адбыўся вочны заключны этап, які праходзіў у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Першым выпрабаваннем стала візітная картка на тэму «Я і мая каманда». Маёй задачай было прыгожа прыпаднесці наш Сокал. Пасёлак Сокал ствараўся для авіятараў, а цяпер гэта адзін з мікрараёнаў Мінска, ён актыўна будуецца, сюды ахвотна едуць жыць шматдзетныя мінчане, але разам з тым ён размешчаны на адлегласці 20 кіламетраў ад сталіцы. Мікрараён незвычайны: ты доўга едзеш па шашы, з'язджаеш з яе, лес быццам бы расступаецца, і ты аказваешся ў экалагічна чыстым аазісе. Прызнаюся, што калі мне паступіла прапанова ўзначаліць дзіцячы садок у Сокале, у найбліжэйшую свабодную суботу (гэта было летам), я прыехаў сюды, пахадзіў вакол садзіка, які быў зачынены, падыхаў паветрам і адчуў: гэта маё! Вырашыў, што мне тут будзе камфортна! З аднаго боку, ціха, утульна, а з іншага — ёсць усе выгоды сталіцы. Развітая інфраструктура, добрыя транспартныя зносіны, школа, паліклініка, храм.

У сваёй візітнай картцы я выйшаў у касцюме авіятара, сеў у сапраўднае крэсла пілота, павітаў усіх «пасажыраў» на борце, запрасіў разам здзейсніць захапляльнае падарожжа, паабяцаў, што канцавым пунктам нашага маршруту будзе курорт «Ластаўчына гняздо» (гэта назва нашага садка): «Прашу прышпіліць рамяні, наш палёт пройдзе ў сяброўскай атмасферы. Лайнер набраў патрэбную вышыню. Нашы ўтульныя апартаменты знаходзяцца ў экалагічна чыстым мікрараёне беларускай сталіцы. Гісторыя курорта «Ластаўчына гняздо» бярэ адлік з далёкага 1986 года. Але пасля мадэрнізацыі, праведзенай у 2015 годзе, ён атрымаў другое жыццё, стаўшы сучаснай установай, якую кожны дзень наведвае 220 выхаванцаў ва ўзросце ад двух да сямі гадоў. І мы з упэўненасцю можам сказаць, што адпавядаем усім сусветным стандартам у катэгорыі «дзіцячы сад» і гэтак далей».

### Выбар зроблены...

Сказаць, што мужчына ў сістэме дашкольнай адукацыі — рэдкасць, не сказаць нічога. Іх можна пералічыць па пальцах. Гэта традыцыйна жаночая сфера, яшчэ больш жаночая, чым школьная адукацыя. І пра гэта міжволі думаеш, назіраючы за мужчынам-кіраўніком у дзіцячым садку...

— Педагогіку нельга падзяляць на мужчынскую і жаночую. Галоўнае ў педагогіцы — гэта ўзровень прафесіяналізму, — адказвае нам Андрэй Дзмітрук.

Свой шлях у прафесію ён пачынаў з Салігорскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа.

— Я сам родам з Палесся, з Драгічынскага раёна. Заканчваў сельскую школу. У маім дзяцінстве мабільнікі ў дзяцей былі рэдкасцю, і інтэрнэта асабліва не было, затое мы часта гулялі ў школу. Дзялілі ролі паміж сабой: я настаўнік, ты вучань. У выніку і я, і мае стрыечныя сёстры аказаліся ў педагагічным каледжы. Я абраў спецыяльнасць «Дашкольная адукацыя». Выкладчыкі былі вельмі моцныя. Уся тэорыя, што выкладалася, неадкладна падмацоўвалася практыкай. Адзін дзень на тыдзень мы абавязкова праводзілі ў дзіцячым садку, і ўсё, чаму нас вучылі ў каледжы, прымянялі на практыцы.

Пасля заканчэння каледжа малады спецыяліст трапіў па размеркаванні ў Мінск, восем гадоў працаваў выхавальнікам у дзіцячым садку. І адразу паступіў на завочную форму навучання на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Прызнаецца, што гісторыя з самага дзяцінства яго захапляла, і ў школьнай праграме менавіта гэты прадмет быў яго любімым. Цікавімся ў нашага героя: выбіраючы выкладанне гісторыі, ён, напэўна, планаваў з часам сысці ў школу?

— Паспрабаваць сябе ў ролі настаўніка гісторыі было маёй марай з дзяцінства, — прызнаецца Андрэй Аляксандравіч. — Магчыма, калі б не было ў маім жыцці каледжа, а потым працы ў дзіцячым садку, і я адразу пайшоў бы на гістфак, то маё прафесійнае жыццё склалася б інакш.

Але нават калі я працаваў выхавацелем, дзеці называлі мяне настаўнікам. Мы з маёй напарніцай Аленай Канстанцінаўнай Дзегцяровай набіралі старшую групу, рыхтавалі дзяцей да школы. Выстройваліся чэргі з бацькоў, якія хацелі аддаць дзіця менавіта да нас.

У дашкольным узросце вельмі важнае развіццё дробнай маторыкі, ад якой залежыць наша памяць і развіццё псіхічных працэсаў. Я прыносіў стос часопісаў, і дзеці нажніцамі выразалі з іх малюнкі, потым мы рабілі разам з аплікацый калажы.

— А я адкрыў для сябе педагогіку яшчэ і як сферу рэалізацыі кіраўніцкай дзейнасці. Крок за крокам з вялікім інтарэсам вучуся быць кіраўніком установы дашкольнай адукацыі і выводжу сваю асабістую формулу поспеху. Часам даводзіцца вырашаць задачы з «зорачкай», памнажаць шматгадовы вопыт маіх калег на ўласнае крэатыўнае мысленне і новыя метады працы і шукаць правільны адказ. Прычым яго нельга зверыць з рашэбнікам ці спісаць у суседа па парце... Бацькі навучылі мяне шукаць і знаходзіць выйсце, нават у самой здавалася б бязвыхаднай сітуацыі, — падкрэслівае Андрэй Дзмітрук. — Гэтага прынцыпу я прытрымліваюся і ў сваёй кіраўніцкай дзейнасці. Не сакрэт, што поспех кіраўніка ў першую чаргу залежыць ад яго каманды. Мяне вельмі добра прынялі ў цяперашнім калектыве. І педкалектыў, і тэхнічны калектыў укамплектаваныя ў нас на ўсе сто працэнтаў. У садку пераважна працуюць тыя, у каго ёсць педагагічны і ўласны сямейны вопыт, але пры гэтым яны яшчэ даволі маладыя, у сярэднім ім па 35—45 гадоў. Усе жывуць у Сокале. А тут, як у вялікай вёсцы, усе адзін аднаго ведаюць. Кухня таксама ўкамплектавана людзьмі, якія гатуюць з любоўю, як дома, таму што ў садок ходзяць іх унукі...



### Асабістая формула поспеху

Дарэчы, пасля заканчэння вучобы на гістфаку наш герой пайшоў у магістратуру БДПУ на спецыяльнасць «Менеджмент у адукацыі», але сістэму дашкольнай адукацыі, дзе яму ўсё роднае і знаёмае, не пакінуў... Пытаемся ў яго: *«Што для вас цікавей: быць на «перадавой», працаваць непасрэдна з дзецьмі ці ўсё ж такі несці адказнасць адразу за ўсіх і займацца кіраўніцкімі задачамі?»*

Ва ўстанове функцыянуе 12 груп, тры з іх — ясельныя, ёсць спецыяльная група для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення і група інтэграванага навучання і выхавання.

Рыхтуючыся да фестывалю «Педагагічны дэбют», Андрэй Дзмітрук вывеў для сябе формулу поспеху. Для гэтага выкарыстаў вобраз цацачнай пірамiды, якую так любяць дзеці.

«Першае кольца пірамiды — гэта аснова, якая задае тон і кірунак развіцця, — тлумачыць ён. — Яно павінна быць трывалым і надзейным. Гэта кіраўнік, які адначасова з'яўляецца менеджарам, псіхолагам, юрыстам, эканамістам, метадыстам, справаводам, гаспадарнікам і г. д. Наступнае кольца — надзейная апора кіраўніка — яго намеснікі. Дзякуючы ім у дзіцячым садку выбудоўваецца вопытная адукацыйная, метадычная і гаспадарчая работа. Педагогі — ключавая частка пірамiды. Яны дзень пры дні аддаюць цяпло сваіх сэрцаў дзецям, закладваюць аснову іх характару, развіваюць іх здольнасці, з'яўляюцца для іх і настаўнікамі, і другімі мамамі. Незаменныя іх спадарожнікі — памочнікі выхавальніка, якія ствараюць у групе парадак і ўтульнасць, клапоцяцца пра малых, гатовы прыйсці на дапамогу ў любой сітуацыі. Важная частка пірамiды — кухары, якія ўмеюць гатаваць смачна, па-дамашняму. Не самы прыкметны, але важны супрацоўнік — гэта вартаўнік. А як жа абысціся без залатых рук рабочых па абслугоўванні, якія і мосцік змайструюць, і электрыку адрамантуюць, без прыбіральшчыкаў памяшканняў і тэрыторыі?! І, вядома ж, на вяршыні пірамiды знаходзяцца выхаванцы, якія радуюць педагогаў сваімі поспехамі і дасягненнямі...»



### Адкрытыя, шчырыя, кранальныя...

У сваім майстар-класе ў фінале на тэму «Мая формула поспеху» Андрэй Дзмітрук параўнаў дзяцінства з букетам нашых родных беларускіх кветак — яркіх, рознакаляровых, якія нібыта пахнуць сонцам і любоўю.

— Букет, дзе кожная кветка — гэта важная частка чагосьці дарагога, асабістага, частка маёй душы, — тлумачыць ён. — Напрыклад, васілёк — сапраўднае ўвасабленне беларускай зямлі. Для мяне васілёк — гэта сімвал нашай гісторыі і памяці пра яе. Сімвал выпрабаванняў, якія вытрымаў наш народ. Вытрымаў і не зламаўся. Гісторыя з самага дзяцінства захапляла мяне. Мне падабалася слухаць нашы цудоўныя беларускія песні, якія спявалі на маім родным Палессі. Я вывучаў беларускія абрады, прыказкі, любіў, калі маці ў дзяцінстве чытала мне народныя казкі і легенды. Бо ў іх столькі мудрасці, вопыту, назапашанага не адным пакаленнем продкаў.

Стаўшы кіраўніком дашкольнай установы, я вялікую ўвагу надаю фарміраванню самасвядомасці нашых маленькіх беларусаў. Чалавек, які не ведае сваёй гісторыі, не мае будучыні. Таму важнымі задачамі свайго калектыву лічу фарміраванне ў дзяцей цікавасці да сваёй гісторыі. Вялікую ўвагу мы ўдзяляем такім святам, як Дзень беларускага пісьменства, Купалле, Каляды, свята ўраджаю. У нашым дзіцячым садку нават ёсць уласны міні-музей «Сялянская хатка», які дапамагае нашым выхаванцам вывучаць побыт і традыцыі беларускага народа. І я лічу гэта вельмі важным.

У маім букеце знайшлося месца цюльпанам — сімвалу 9 Мая (бо менавіта гэтую кветку мы дорым ветэранам, нясём да абеліскаў), ландышам, рамонкам, півоням, ружам і падснежнікам. За кожнай кветкай стаяць пэўныя сэнсы. Падснежнікі вельмі падобныя на нашых дзяцей — яны адкрытыя, шчырыя, кранальныя. Дзеля іх мы жывём і працуем. Дзяцей трэба перш за ўсё любіць. І гэта галоўнае правіла калектыву нашай установы, найвышэйшая наша каштоўнасць. **Дзіця — гэта асоба, якую трэба паважаць, непаўторная індывідуальнасць, якую трэба развіваць.**

Вяртаючыся да вашага пытання, што цікавей — работа з дзецьмі ці кіраўніцкія задачы, — скажу так: мне вельмі важна не губляць непасрэднага кантакту з малышамі, размаўляць з імі, слухаць іх, удзельнічаць у мерапрыемствах і ранішніках. Дзеці — вельмі шчырыя і адкрытыя. Яны табе давяраюць, і ты не маеш права не апраўдаць іх даверу.

Увогуле, **уменне выслухаць, усё роўна, хто гэта — калега, які прыйшоў па параду, або дзіця, якое давярае табе нейкую сваю таямніцу, — вельмі важная якасць кіраўніка. Як і ўменне матываваць навакольных, адказнасць, аналітычныя здольнасці, камунікабельнасць.**

У сваёй дзейнасці я вельмі цаню давер паміж мной і калектывам, імкнуся не толькі цярпліва выслухаць суразмоўцу, але і знайсці правільнае рашэнне праблемы, з якой ён прыйшоў да мяне.

Мой кожны дзень распісаны: прыходжу ў садок, апранаю халат, іду на кухню. Там я кантралюю арганізацыю харчавання нашых выхаванцаў. Потым іду па групах, сачу за адукацыйным працэсам, гляджу, колькі дзяцей прыйшло, цікаўлюся іх станам здароўя. Гэты рытуал вельмі важны. У дзяцей я звычайна пытаюся, як прайшлі выхадныя, а выхавальнікі распавядаюць, што плануюць праходзіць сёння на занятках.

### На сваім месцы

Гэтымі днямі ў садзіку праходзяць навагоднія святы. «Дзеці вераць у цуды, у Дзеда Мароза, пішуць яму лісты», — кажа наш суразмоўнік.

*Цікавімся, а дарослы Андрэй Аляксандравіч верыць у цуды? І ці ёсць у яго сям'і нейкія навагоднія традыцыі?*

— Канешне, веру. І жаданне пад бой курантаў загадваю. У нашай сям'і было прынята збірацца на Раство ў бабулі. У Святы вечар напярэдадні свята стол засцілаўся сенам. Зверху клалі абрус. Ежа была посная. Бабуля варыла вельмі смачны кісель. А мы з сёстрамі з 6 на 7 студзеня ішлі калядаваць, спявалі калядныя песні, а потым хваліліся пачастункамі, якія назбіралі. Я ўвогуле ўсё дзяцінства наведваў нядзельную школу пры праваслаўным храме. Калі бацюшка нам штосьці даручаў, мы ніколі не маглі яму адмовіць. І калі камусьці была патрэбная наша дапамога, абавязкова ішлі і дапамагалі. Лічу гэты аспект духоўнага выхавання вельмі важным. Мы разбіралі біблейскія гісторыі, шукалі мараль тых ці іншых учынкаў... На Вялікдзень мы з маёй малодшай сястрой абавязкова збіраемся ў бацькоў. Гэта таксама наша сямейная традыцыя...

*«Уявіце, што ў вас з'явілася магчымасць вярнуцца ў той час, калі вы рабілі свой прафесійны выбар. Што вы маглі б сабе сказаць? Можа, ёсць хлопцы, якія не вырашаюцца разбурыць стэрэатып аб жаночай прафесіі, а ваш прыклад стане для іх сур'ёзным аргументам...»*

— За дзесяць гадоў свайго прафесійнага шляху я ні разу не пашкадаваў пра свой выбар. Свет педагогікі — вельмі цікавы, адказны і шматгранны. Ну хто зробіць нашых дзяцей шчаслівымі, калі не мы? Гэта ж так важна — удзельнічаць у іх сталенні і развіцці. Менавіта гэта жаданне і прывяло мяне ў педагогіку, — упэўнена адказаў наш суразмоўнік. — Я ўдзячны году, які прынёс мне перамогу ў прафесійным конкурсе, удзячны яму за тое, што пазнаёміўся з мноствам выбітных людзей і сапраўдных прафесіяналаў, бо за маёй перамогай стаяла магутная каманда — калектыў садка, педагогі Кастрычніцкага раёна сталіцы, Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі. Конкурс даў каштоўны вопыт, уменне трымацца на публіцы. І, галоўнае, упэўненасць у тым, што я — на сваім месцы. Калі дзіця раніцай з ахвотай ідзе ў дзіцячы садок — у гэтым заслуга ўсяго нашага калектыву...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (7 %), бел. руб. | Шаг аукциона (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15317 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – пристройка к мебельному цеху, общая площадь – 523,3 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажная кирпичная пристройка к мебельному цеху А1/к); Барабан сушильный АВМ 1,5, инв. № 70068; Бункер БН Ф3.30.00 СБ, инв. № 49306001; Бункер М 402.02.00.СБ, инв. № 70081; Весы платформенные ВСП-4 2000 (1500*1250) РФ, инв. № 47035002; Весы электр. лаборат. ВК-3000 имп. РБ, инв. № 47040001; Винтовой конвейер (желоб, трубовал, витки, шнек, мотор-редуктор, муфта), инв. № 41714005; Гидростанция STNG2-80-K7.5-0225/A120 (имп. РБ), инв. № 46132009; Дробилка молотковая, инв. № 971; Дробилка молотковая ДМ-10 с двиг. 45 кВт, инв. № 50426522; Дымосос ДН-11,2, инв. № 50426254; Емкость металлич. 50 куб. м, инв. № 70223; Емкость металлич. 50 куб. м, инв. № 70224; Емкость металлич. 75 куб. м, инв. № 70225; Конвейер ленточный, инв. № 50426135; Конвейер винтовой в желобе вертикальный ф300*4,07 м с электромот. N=3,0 кВт, РБ, инв. № 41714002; Конвейер винтовой в желобе горизонтальный ф260*4,06 м с электромот. N=2,2 кВт, РБ, инв. № 41714001; Конвейер винтовой ф 350 мм L=3800 мотор-редуктор 1,1 кВт, инв. № 41714003; Ленточн. транспортер в упаковку мешками, инв. № 70060; Охладитель-сортировка, инв. № 70139; Пеллетоупаковщик SYNTHASI с загр. рамой, инв. № 50426338; Пневмотранспорт сухой щепы, инв. № 70136; Пневмотранспорт удаления мелкой фракции, инв. № 70140; Преобразователь частоты INNOVERT VENT IVD113B43A (11,0кВт*380В) выходной ток 24А, инв. № 40709004; Прессгранулятор, инв. № 962; Сварочное устройство, инв. № 70067; Скребковый транспортер, инв. № 50026-1; Скребковый транспортер на охладитель, инв. № 70138; Скребковый транспортер (на топку), инв. № 70133; Сортировка, инв. № 70127; Стол произв. металлический размер 950*600*860, инв. № 70013003; Стружкоотсос (пылесос) ОР-1500 (на 1 мешок, 220 вольт, 1,5 кВт) (Россия в РБ), инв. № 41602001; Топка 1,5МВт, инв. № 70134; Транспорт. система накоп. и под. сух. сырья, инв. № 70152; Транспортная система подачи исходного сырья, инв. № 70126; Упаковочное устр-во-автомат, инв. № 70061; Устройство низковольтное комплектное ШРС-02-225/400-IP54-УЗ (шкаф распределит. силовой), инв. № 40703004; Устройство низковольтное комплектное ШУД-01-200/400-IP54-УЗ (шкаф управления дробилкой), инв. № 40703003; Циклон СБ, инв. № 41600003; Шкаф ПР85 + счетчик СА4У-699М, инв. № 70104; Шкаф распред. ШР-11-73505, инв. № 30039; Шкаф упр. топкой + частот. преобр., инв. № 70143; Эл./пульт упр-я производством, инв. № 70058 | 1 302 588,00 | 91 181,16 | 65 129,40 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-17452 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад, общая площадь – 53,9 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный склад); Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15322 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – складское помещение, общая площадь – 286 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное складское помещение с пристройкой основного назначения Б1/к); Бойлер Pellets Fuzzy Logic, инв. № 50426289; Кондиционер IGC 09AX (внутренний RAS + наружный RAC-блоки), инв. № 70041015; Кондиционер IGC 12AX (внутренний RAS + наружный RAC-блоки), инв. № 70041016; Водонагреватель накопительный электрический ER 200 V THERMEX, инв. № 70103006 | 489 420,00 | 34 259,40 | 24 471,00 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-17454 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – здание трансформаторной подстанции, общая площадь – 44,3 кв. м, составные части и принадлежности – двухэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции А2/к); Трансформатор 400, инв. № 50426146; Трансформатор ТМГ12-340/10-У1 10/0, 4 Квт Д/УН -11, РБ, инв. № 40701001; Кабельные линии эл. перед., инв. № 30100-1 | 52 560,00 | 3 679,20 | 2 628,00 |
| 4 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15318 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – мебельный цех, общая площадь – 1146,6 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный мебельный цех с двумя пристройками 1Б1/к, 1В1/к); Навес над рампой мебельного цеха, инв. № 20349004; Система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре (меб. цех), инв. № 47075001; Ворота секционные 2150*2900 (меб. цех), инв. № 70036004; Ворота секционные подъемн. СПР ProTrend 1950*2870 (меб. цех), инв. № 70036015; Жалюзи-роллета 1100*23 00 ЖЗ AER44/s ПИМ 102, инв. № 70019016; Жалюзи-роллета 1530*23 00 ЖЗ AER44/s ПИМ 102, инв. № 70019015; Котёл Pelet Fuzzy Logic, инв. № 50426385; Котел автомат. тв/топл. (гранул.) 50 кВт, имп., инв. № 40002003; Пожарный шкаф – пожарный инвентарь, инв. № 70000002; Пожарный шкаф – пожарный инвентарь, инв. № 70000004; Пожарный щит – пожарный инвентарь, инв. № 70000003; Система вентиляционной в покрасочн. камере МЦ, инв. № 41602021; Шкаф ШР-11, инв. № 50426112 | 1 226 136,00 | 85 829,52 | 61 306,80 |
| 5 | Молниеотвод, инв. № 20608001 | 15 120,00 | 1 058,40 | 756,00 |
| 6 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15313 (назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – цех оцилиндровки (цех хозобихода № 1), общая площадь – 575,6 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный металлический цех оцилиндровки с тремя пристройками основного назначения Б1/к, В1/к, Г1/бл); Ворота роллетные (ЦДО), инв. № 70036002; Кран мост. опорн. г. п. 3,2 т, инв. № 30123; Рельсовый путь с грузовый тележкой, инв. № 44105; Подкрановая эстакада 35П, инв. № 30174; Электро-тельфер 13Т45516 г/п 3,2 т Н=6м, инв. № 50426043; Тележка цеховая, инв. № 30182; Теплогенератор ТГ-300, инв. № 40115 | 181 920,00 | 12 734,40 | 9 096,00 |
| 7 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15316 (назначение – здание неустановленного назначения наименование – цех распиловки хозобихода № 2, общая площадь – 542,5 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный металлический цех распиловки хозобихода с пристройкой Б1/к); Ворота секционные 4775*3500, инв. № 70336; Кран мостовой опорный однобалочный г. п. 3,2 т, инв. № 41702001; Таль электрическая г. п. – 3,2 т, в/п - 6,0 м (13Т 45516), инв. № 41721002; Шкаф ШР-11 инд. проект, инв. № 50426170 | 163 932,00 | 11 475,24 | 8 196,60 |
| 8 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21429 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для хранения ГП 1, площадь застройки – 113 кв. м, составные части и принадлежности – навес для хранения ГП 1) | 6 960,00 | 487,20 | 348,00 |
| 9 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21428 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для хранения ГП 2, площадь застройки – 114 кв. м, составные части и принадлежности – навес для хранения ГП 2) | 6 960,00 | 487,20 | 348,00 |
| 10 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21430 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для хранения ГП 3, площадь застройки – 113 кв. м, составные части и принадлежности – навес для хранения ГП 3) | 6 720,00 | 470,40 | 336,00 |
| 11 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21431 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес под пропитку № 3, площадь застройки – 166 кв. м, составные части и принадлежности – навес под пропитку № 3) | 9 840,00 | 688,80 | 492,00 |
| 12 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-21427 (назначение – сооружение специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – навес для складирования щепы, площадь застройки – 337 кв. м, составные части и принадлежности – навес для складирования щепы) | 20 160,00 | 1 411,20 | 1 008,00 |
| 13 | Навес с деревянными столбами для велосипедов, инв. № 20349001 | 1 680,00 | 117,60 | 84,00 |
| 14 | Комплект оцинкован. инвентарн. навеса сборно-разборного типа 42*10*4,5 (М-С2-3-06-В-0336) РБ, инв. № 20348000 | 56 760,00 | 3 973,20 | 2 838,00 |
| 15 | Комплект оцинкован. инвентарн. навеса сборно-разборного типа 50*14*4,5 (М-С2-3-06-В-0700) РБ, инв. № 20348001 | 119 760,00 | 8 383,20 | 5 988,00 |
| 16 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-15315 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – караульное помещение, общая площадь – 29,6 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажное блочное караульное помещение) | 19 680,00 | 1 377,60 | 984,00 |
| 17 | Изолированное помещение с инвентарным номером 601/D-4550 (назначение – квартира, наименование – квартира, общая площадь – 50,6 кв. м); Вытяжка кухонная Germes «Честер», инв. № 70030062; Комплект корпускной кухонной мебели (7 шкафов + столешница), инв. № 70030053; Мойка L65848-6R Ledeme + Смеситель для кухни Ledeme L5913-1, инв. № 70030061; Плита газовая бытовая 4-х горелочная GEFEST ПГ 1200С5, инв. № 70103003; Раковина «Керамин» «Верона 60» + Пъедестал под умывальник + Крепление для умывальника, инв. № 70030063 | 97 776,00 | 6 844,32 | 4 888,80 |
| 18 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-16172 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж, общая площадь – 175,4 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажный кирпичный гараж с двумя пристройками 2Б1/бл, 2В1/бл, навесом 1); Ворота секционные подъемн. СП.Р.Trend-TS.Г.КП.3100*2850 RAL8017 (гараж 50426074), инв. № 70036016; Ворота роллетные (гараж), инв. № 70036001 | 149 280,00 | 10 449,60 | 7 464,00 |
| 19 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-31986 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – блочно-модульная котельная на твердом топливе, общая площадь – 143 кв. м, составные части и принадлежности – одноэтажная сэндвич-панельная блочно-модульная котельная на твердом топливе с навесом а, дымовой трубой б); Установка водогрейная тв/топл. УВТ-1000Е (РФ), инв. № 40002004; Бак мембранный N 800/6 Reflex (Германия), инв. № 42923001; Генератор HONDA SILENT DIESEL GENERATOR EXT 12D, 2002 г., б/у, инв. № 40205005; Компрессор Remeza СБ4/Ф270.LB75, инв. № 41400004; Оборудование автоматизированного склада топлива СТ. 1350-2-15 (РФ), инв. № 44020015; Осушитель охлаждающий RFD31, DR001060, инв. № 41417001; Система удаления золы за пределы котельной ТЗУ 300.15 (РФ), инв. № 41711009; Скребковый транспортер с мотор-редуктором ТС.300.8 (РФ), инв. № 41711008; Установка компрессорная СБ4/С-100 LB40, инв. № 41400001; Установка умягчения воды ФИ-Na-2-20 0/020 (РБ), инв. № 49010001 | 806 004,00 | 56 420,28 | 40 300,20 |
| 20 | Сушильный комплекс конвекционного типа мод. 4EPL85/72/41.Secal (Италия), инв. № 44500003; Трубопровод технологический, инв. № 30116001 | 849 120,00 | 59 438,40 | 42 456,00 |
| 21 | Емкость для пропитки ЦДО 3.06.001, инв. № 50426492; Подъемник гидравл. NF20R, инв. № 30046 | 11 760,00 | 823,20 | 588,00 |
| 22 | Бревнотаска БР-37.ПТ5504, инв. № 30083; Кран мостовой опор. г.г. 5 т., инв. № 30134; Кран мостовой 5тс, инв. № 30062; Таль эл-кая канатная 13ГК 10636, инв. № 50426361; Транспортер поперечн. ЛОТ 1-01, инв. № 30125; Электротельфер EKN20 MHL 6-25 2/1 H12 V8 C (г/п 5, в/п 12 м) Болгария имп. в РБ, инв. № 41721003; Эстакада бревн. мет. ПТ550, инв. № 30131 | 99 600,00 | 6 972,00 | 4 980,00 |
| 23 | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-17453 (назначение – сооружения неустановленного назначения, наименование – объекты благоустройства производственной базы, перечень объектов, входящих в состав – ограждение, ворота, проезжая часть, общая площадь проезжей части – 5995 кв. м, общая длина ограждений – 596,5 м) | 48 000,00 | 3 360,00 | 2 400,00 |

В отношении лотов №№ 1–23 проводятся первые торги

**Местонахождение лотов №№ 1–16, 18, 20–23:** Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40.
**Местонахождение лота № 17:** Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», д. 6, кв. 47.
**Местонахождение лота № 19:** Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40/1

Лоты №№ 1–16, 18–23 расположены на земельном участке с кадастровым номером 623255700001001900, площадь 2,6116 га, целевое назначение – для обслуживания и эксплуатации зданий и сооружений, на праве аренды до 28.11.2026 **(залог права аренды у ОАО «Приорбанк»)**

В отношении составных частей лотов 1, 2, 4, 6, 7, 19, 20 имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Приорбанк»)

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **24 января 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 21 декабря 2023 года до 16.00 22 января 2024 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 24.01.2024.
